# БЕЛАРУСКІ НАРОДНЫ КАЛЯНДАР

У кожнага народа спрадвеку вёўся свой каляндар, у якім з пакалення ў пакаленне перадаваліся мудрасць, веды, вопыт жыццёвыхназіранняў. Мелі такі каляндар і беларусы. Багацейшы духоўны свет нашых продкаў, іх надзвычайны талент, яскравая фантазія, гумар адбіліся ў абрадах і звычаях, гульнях і песнях, прыкметах і павер`ях, якімі перасыпаны ледзь не кожны дзень гадавога кола. Абапіраючыся на бацькоўскія традыцыі і веру, беларускі працаўнік трымаў у памяці шматлікія парады і забароны, выказаныя вобразным трапным словам. Ён добра ведаў, калі можна весяліцца, а калі ўстрымлівацца ад забаў, калі можна брацца за тую ці іншую працу, а калі, наадварот, адкласці яе, каб не нашкодзіць сабе і блізкім.

Каляндар ахоплівае дзень за днём увесь год, змяшчае ў сабе шматлікія абрады, звычаі, прыкметы, павер`і, прыказкі, праз якія глыбока раскрываецца ўнутраны свет працоўнага чалавека, яго штодзённыя клопаты і спробы разгадаць таямніцы навакольнай прыроды. Шматвяковы вопыт, назапашаны многімі пакаленнямі папярэднікаў, быў для земляроба азбукай і граматыкай усяго жыцця. Перададзены ў спадчыну, ён дапамагаў арыентавацца ў з`явах прыроды, ад якіх нярэдка залежаў ураджай - крыніца існавання селяніна, усёй яго сям`і. У працэсе гістарычнага развіцця, дзякуючы пільнаму ўгляданню ў навакольны свет і асэнсаванню безлічных яго форм, чалавецтва вучылася разумець мову прыроды, кіравацца яе падказкамі ў сваіх будзённых справах.

...Святыя Сакаркі наперад пайшлі. (22/9 сакавіка)

Святы Аляксей сохі чэшаць. (30/17 сакавіка)

Святое Благавешчанне заворываець, (7 красавіка/25 сакавіка)

Святы Вербіч вярбу пасвянцваець, (нядзеля перад Вялікаднем)

Чысты чацвер ячмень засяваець, (дзень Вербнага тыдня)

Святое Вялічка з красным яечкам. (адна з нядзель у перыяд з 4 красавіка па 8 мая)

Першы дзень пірагі маюць,
А сярэдні дзень пагуляюць, (панядзелак, другі дзень Вялікадня)
А паследні дзень выпраўляюць. (аўторак, апошні дзень Вялікадня)

Радаўніца статак запасываець, (першы або другі аўторак пасля Вялікадня)

Святы Юры, божы пасол (6 мая/23 красавіка)
Да Бога пайшоў,
А ўзяў ключы залатыя,
Адамкнуў зямлю сырусенькую,
Пусціў расу цяплюсенькую,
На белы свет і на ўвесь свет.

Святы Барыс бабы сеець, (15/2 мая)

Святы Мікола па межах ходзіць. (22/9 мая)
Па межах ходзіць, жыта родзіць,
Урасціўся, умачыўся,

Пад залаты пояс падаткнуўся.
Святы Ушэснік - жыта выплываець, (чацвер шостага тыдня пасля Вялікадня)
Святая Сёмуха навозы возіць
І Бога просіць (нядзеля сёмага тыдня пасля Вялікадня)
Святы Дзевятнік жыта раўнуець, (чацвер на дзевятым тыдні пасля Вялікадня)
Святая Дзесятуха жыта красуець, (пятніца на дзесятым тыдні пасля Вялікадня)
Святы Іван пчолы садзіць (7 ліпеня/24 чэрвеня)
Пад пералазам шасцёра разам.
Святы Пётра жыта спеліць (12 ліпеня/29 чэрвеня)
Святы Паўлюк грэблі робіць, (13 ліпеня/30 чэрвеня)
Святы Дзям`ян сена грабіць, (14/1 ліпеня)
Святы Кузьма сярпы робіць (14/1 ліпеня)
Залатыя, новыя і сталёвыя.
Святы Ілья - слаўная жняя, (2 жніўня/20 ліпеня)
Святы Барыс снапы зносіць (6 жніўня/24 ліпеня)
Святыя Ганны дамоў возяць, (7 жніўня/25 ліпеня)
Святы Спас жыта пасвянцаець, (19/6 жніўня)
Святая Прачыстая папары мяшаець (28/15 жніўня)
І жыта засяваець.
А другая ёй памагаець, (21/8 верасня)
Святы Міхайла з халодным ветрам, (19/6 верасня)
Святое Узвіжанне з поля збіраець, (27/14 верасня)
Святы Пакроў зямлю пакрыў, (14/1 кастрычніка)
Зямлю - лістом, а ваду - лядом.
Святы Юры грудай гвоздзіць, (9 снежня/26 лістапада)
Святы Мікола снегам мосціць. (19/6 снежня)
Прышлі Калядкі - гаспадарам парадкі. (7 студзеня/25 снежня)
Святая Васілля дзяжу мясіла, (14/1 студзеня)
Пірагі пякла і рагатыя, і букатыя.
Святое Вадохрышча воду пасвянцаець, (19/6 студзеня)
Людзей пакрапляець.
Святыя Грамніцы свечы пасвянцаюць. (15/2 лютага)
Прыйшлі Саракі да другіх Саракоў... (22/9 сакавіка)
(з валачобнай песні)

## СТУДЗЕНЬ

Студзень - году пачатак, а зіме - палавіна.

Студзень хаты студзіць - рана гаспадароў будзіць.

Студзень пагодны - будзе год плодны.

Калі студзень імглісты - мокры год, калі халодны - позняя вясна і халоднае лета.

Сама назва гэтага месяца красамоўна гаворыць пра яго характар: студзень - значыць, сцюдзёны. "Студзень - году пачатак, зіме - сярэдзіна". Нярэдка па народных прыкметах год падзялялі на дзве роўныя часткі: адна пачыналася з 1 студзеня, другая - з 1 ліпеня. Заўважаючы асаблівасці надвор`я ў пэўны дзень першага паўгоддзя, меркавалі пра надвор`е ў адпаведны дзень другой паловы года. Супастаўлялі ў першым і другім паўгоддзі цэлыя месяцы, а то і поры года. Па студзеню мяркавалі пра будучую вясну ("Як студзень цёплы на лік, дык завідны сакавік") і пра лета ("Студзень мяце - ліпень залье"). Па характару першага месяца сяляне стараліся вызначыць і набытак, які чакаецца ў агародзе і на полі: "Студзень пагодны - год будзе плодны". Гнілое надвор`е на пачатку года не абяцала ўцехі чалавеку: "Калі ў студзені дажджы - дабра не жджы".

1/19 Цяпер у гэты дзень мы прывыклі адзначаць Новы год. У старым жа каляндары ён не лічыўся святочным. Працягваючыся з папярэдняга года, апошні свой тыдзень дабываў Піліпаўскі пост. Ён заканчваўся з надыходам урачыстага зімовага святкавання, якое на працягу двух тыдняў (з 7 па 19 студзеня) ахоплівае некалькі свят і вядома ў народзе як Каляды.

7/25 Ражство Хрыстова. Пасля шматтыднёвага посту нарэшце прадстаўлялася доўгачаканая магчымасць паесці ўволю скаромнага. З гэтага часу па сялу пачыналі хадзіць калядоўшчыкі:

Добры вечар, пане гаспадару, ой, Каляда, ой, Каляда!
Харошыя маеш ты сыночкі, ой, Каляда, ой, Каляда!
Ой, што ж яны ў цябе робяць? ой, Каляда, ой, Каляда!
У святлічцы золата важаць, ой, Каляда, ой, Каляда!
Наважылі трыццаць пудоў і чатыры, ой, Каляда, ой, Каляда!
Тыя трыццаць пану гаспадару аддалі, ой, Каляда, ой, Каляда!
А тыя чатыры нам, каляднічкам і калядзе, ой, Каляда, ой, Каляда!

На працягу ўсіх Каляд нельга было нічога ні шыць, ні віць, ні плесці, ні рабіць крывога і колападобнага, ні сячы сякераю (напрыклад, ставіць агароджы, пячы абаранкі, рабіць закруткі для саней), іначай, казалі, дзеці і жывёла, якія павінны з`явіцца на свет, абавязкова народзяцца пакалечанныя.

14/1 Стары Новы год. Васілле. У навагодніх павер`ях адчуваецца прысутнасць магіі "першага дня". Першы дзень года, праведзены належным чынам, нібыта гарантаваў удачу на ўвесь год. Хто з хатніх жыхароў у самы першы дзень года апярэдзіць астатніх, прынясе са студні вады і ўмыецца - на працягу года будзе рухавы і бадзёры. Калі снег на Новы год падаў з самага ранку, то і зіма прадбачылася снежная. Калі на Васілле вецер дзьме з усходу - трэба было чакаць гарачага і сухога лета, калі з поўдня - умеранага, заходні вецер абяцаў мокрае лета, паўночны - халоднае, з градам.

19/6 Вадохрышча - апошняе свята каляндарнага цыкла: "Святое Хрышчэнне і Калядам прашчэнне". У гэты дзень, згодна з праваслаўным календаром, святкавалася хрышчэнне Ісуса Хрыста, асвячалася вада. Народ верыў у цудадзейную сілу такой вады і выкарыстоўваў пры розных бытавых выпадках і здарэннях: яе давалі выпіць хвораму, ёю апрысквалі новую хату перад тым, як засяліцца, і вуллі, каб лепш вяліся пчолы. Хрышчэнскай вадою

асвячалі поле перад сяўбою. Дзе-нідзе ў гэты дзень дазвалялася выконваць некаторыя сялянскія работы, забароненыя на працягу ўсіх Каляд. На Вадохрышча прыпадалі самыя вялікія маразы, пасля якіх зіма паступова паварочвалася на лета. У народзе казалі: "Трэшчы не трэшчы, прайшлі Вадахрэшчы - не к Ражству, а к Пятру", маўляў, больш маразоў ўжо не будзе. Вадохрышча было днём, па якім арыентаваліся ў вызначэнні будучага надвор`я ("На Вадохрышчы вельмі сцюдзёна - у жніво вельмі горача"), спрабавалі прадказаць і якасць будучага ўраджаю ("На Вадохрышча дзень цёплы - будзе хлеб цёмны").

**ЛЮТЫ**

Прыйдзе люты - спытае, як ты абуты.

Ад лютага зіма збягае цёмнымі начамі.

Завірухі і мяцелі ў лютым адгудзелі.

У лютым востры мароз, кароткая зіма.

На парозе другі месяц года. "Пытаецца люты, ці добра ногі абуты" - гаварыла прыказка. І сапраўды, зіма ў гэту пару звычайна была ў самай сіле. Па стану лютага прадказвалі асаблівасці будучага надвор`я. Калі ў гэтым месяцы быў моцны мароз, зіма павінна працягвацца нядоўга. Як і студзень, люты меў свой адпаведнік у другім паўгоддзі: раз люты марозны і сухі, то жнівень гарачы. Па тым, наколькі высока нападае ў лютым снег, меркавалі пра вышыню травы ўлетку. Народны вопыт дазволіў вывесці калісьці і такое назіранне: які дзень першага лютага (паводле старога стылю), такімі выдадуцца і апошнія дні месяца.

15/2 Грамніцы, альбо Стрэчанне. Першая назва свята, як мяркуюць, пайшла ад язычніцкага бога Грамоўніка, якому прыпісвалася ўтварэння веснавых навальніц і дажджоў. Пасля гэтага дня павінны страціць сваю ўладу змрочныя боствы зімы: "На Грамніцы - паўзіміцы" або "Як прыйдуць Грамніцы - скідай рукавіцы". У засеках памяншаўся запас збожжа, і гэты святочны дзень таксама выступаў у гаспадарцы са сваёй меркаю: "Грамніца - хлебу палавіца". Другую назву - Стрэчанне, якая паходзіла ад царкоўнага "Сретенье", народ тлумачыў як сустрэчу зімы з вясною:

А ў нас сёння Стрэчанне, Стрэчанне,
Зіма з летам стрэлася, стрэлася.
Лета зіму піхнула, піхнула.
І ножачку звіхнула, звіхнула.
Зіма пайшла плачучы, плачучы,
Лета пайшло скачучы, скачучы.

Не дзіўна, што гэта пераломнае свята звязана з шэрагам метэаралагічных прыкмет. Найбольш пашыраная з іх выкарыстана ў паэтычнай мініяцюры: "Калі на Грамніцы певень з-пад страхі нап`ецца вадзіцы, то на Юр`е - вол пад`есць травіцы". Калі ж на Грамніцы здараўся вялікі мароз - снег павінен быў праляжаць нядоўга, а вясна і лета не абяцалі нічога добрага. Грамнічная мяцеліца прадказвала, што вясна затрымаецца даўжэй, чым звычайна, у выніку чаго вычарпаюцца запасы корму для

жывёлы. Рэзкае пацяпленне надвор`я не давала селяніну разлічваць на прыбытак у полі і на агародзе: "Як на Грамніцы адліга - з ураджаю будзе хвіга". Пры адсутнасці адлігі можна было спадзявацца на пагоднае, сухое лета.

На Беларусі гэта свята знамянальна такім абрадам, як асвячэнне свечак у царкве. Грамнічныя свечы (або проста "грамніцы") асабліва шанаваліся ў народзе. Іх запальвалі з вераю ў дапамогу ў час навальніцы, каб маланка не спаліла хату; давалі паміраючаму чалавеку, каб полымя асвятляла яму шлях на той свет, ачышчала душу ад грахоў. Жыло ў народзе перакананне, што грамнічных свечак баіцца "нячыстая сіла", таму і вешалі іх ля ўваходу ў хлеў ці на стайню, каб, маўляў, ведзьмы не адабралі ў кароў малако і не заездзілі да смерці коней.

**САКАВІК**

Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.

Сакавік зялёны - ураджай благі.

Як у сакавіку туман, дык у жніво дождж - пан.

Няма ў сакавіку вады - няма ў красавіку травы.

Сучасная беларуская назва трэцяга месяца года і першага месяца вясны паходзіць ад слова "сок". У гэтую пару сок пачынае цячы з дрэў. У адным з тэкстаў XIV стагоддзя, які пісаўся ў полацкім манастыры, зафіксавана найменне сухий. Францыск Скарына ў "Малой падарожнай кніжцы" (1522) згадвае месяц марець, а ў астрожскім "Псалтыры" (1597) - березол. Апошняя назва, дакладней яе варыянты, захаваліся ў чэшскай мове - brezen, украінскай - березень. Лацінскую форму ўтрымліваюць французская - mars, англійская - march, нямецкая - Marz, польская - marzec, руская - март, італьянская - marzo і інш.

Рымскі martius, згодна легендзе, "абвясцілі" Ромул і Рэм у гонар бога сонца і вайны Марса, апекуна земляробства і жывёлагадоўлі, які ўвасабляў творчыя сілы прыроды, і быў першым месяцам года аж да 153 года да нашай эры (таксама і ў многіх народаў, у тым ліку беларусаў).

Пра пару, калі зіма павінна саступіць месца вясне, у народзе гаварылі: "Люты вады падпусціць, а сакавік падбярэ". Але надта давярацца лагоднасці першага вясновага месяца было б неабачліва, паколькі зіма ў гэты час яшчэ не здалася: "Марац кусае за палец". Калі зямля зарань вызвалялася ад снежнага покрыва і агаляла азіміну ў той час, як прыціскалі маразы, селянін мог разлічваць на небагаты ўраджай: "Калі жыта ў марцы глядзіць на неба, не есці тады хлеба".

Сакавік часамі снегам сее, а часамі сонцам грэе.
Як у сакавіку туман, дык у жніво дождж - пан!
У сакавіку зіма не гніе - у красавіку трава не расце.

9/24. Іван, Эразм. Праз тры тыдні і адзін дзень пасля Грамніц значыўся прысвятак Паўраценне, або Абратанне (ад царкоўнага "Обретение" -

знаходжанне галавы Іаана Хрысціцеля). Асабліва шанавалі гэты дзень пчаляры. Яны заглядвалі ў вуллі і калі знаходзілі ("обретали") пчол жывымі, то ўжо не сумняваліся ў паспяховай іх перазімоўцы. На Валожыншчыне слова "паўраценне" тлумачылі тым, што мядзведзь у бярлозе ў гэты дзень паварочваецца на другі бок. "Янавай галавы баіцца зіма", г.зн. цяпло ўсё больш упэўнена сыходзіць на зямлю.

22/9. Сорак пакутнікаў, або па-народнаму Саракі (Сорокі). Лічба, што ўваходзіла ў назву свята, шырока абыгрывалася ў павер`х і абрадавых дзеяннях, якія бытавалі ў гэты дзень. Калі на Саракі здараўся мароз, то меркавалі, што пасля яго адбудзецца яшчэ сорак маразоў. На Саракі сарока пачынае віць гняздо і прыносіць для яго 40 пруткоў. Раніцай перад усходам сонца хлопчыкі стараліся перакінуць цераз страху 40 трэсак: калі гэта ўдасца, то ўлетку будуць добра знаходзіцца птушыныя гнёзды. Свае звычаі былі і ў дзяўчат: яны пераломвалі 40 дошчачак і перарывалі 40 вяровачак і шнуркоў. Прадметы, што пераломваліся і разрываліся, напэўна, сімвалізіравалі сабою сілы, якімі была скавана зямля, і выкананне гэтага абраду мела сваёю мэтаю наблізіць надыход цяпла, абудзіць ад зімовага сну ўсю жывую прыроду. "На Саракі дрэвы адпушчаюцца" - сведчылі народныя назіранні. "На Саракі прыляцелі з-за мора птакі" - падказвалі вясковыя фенолагі і нават удакладнялі: "Прылятае 40 жаваранкаў". (Ці не таму іх прылёт адзначалі гаспадыні, выпякаючы ў гэты дзень для дзяцей 40 жаваранкаў з цеста і кладучы ў адзін з іх "саракоўку" - 20 капеек? Каму яна дастанецца - той будзе шчаслівы.) Надвор`е на Саракі таксама прыцягвала ўвагу чалавека. Калі ад Грамніц да Саракоў не ішлі дажджы і не псавалася дарога, то летам чакалася засуха. Калі ў гэты дзень на стрэхах ляжаў снег, то на Благавешчанне ён будзе пакрываць усю зямлю, а на Юр`я - асобныя мясціны. Калі на Саракі ўволю нап`ецца вол ад расталых ледзяшоў - будзе добрая вясна. Зрэшты яна ўжо стаяла на двары: "Саракі - не суйся блізка да ракі", г.зн. надышла пара разводдзя. На Усходнім Палессі дзяўчаты хадзілі гукаць вясну на Саракі:

Жаваранак, ранняя птушачка,
Чаго так рана з выраю вылятаеш?
А там пры даліне - там ляжаць крыгі,
А там пры дарозе - снягі і марозы.
А я тыя крыгі крыламі разаб`ю,
А я тыя маразы нагамі растапчу.

На Саракі прыладжвалі арэлі і абавязкова гушкаліся - казалі, "каб камары не елі" (Шумілінскі раён).

**КРАСАВІК**

Красавік сініць і дзьме, бабам цяпло нясе, а мужык пазірае ды галавою ківае.

У красавіку грымот - цёплы будзе год.

Красавік сушыць, нічога з зямлі не рушыць.

У красавіку зямля прэе.

У красавіку дождж праходзіць, сонца грэе - тады ўсякі не збяднее.

Назва чацвёртага месяца года паходзіць ад слова "красавац", бо ў ім з`яўляюцца першыя краскі-кветкі. Гэтаму адпавядае і другое найменне, што сустракаецца ў старажытнай літаратуры, - кветень. У прыватнасці яго ўжывае Ф.Скарына ў "Малой падарожнай кніжцы". Такая форма захавалася ва ўкраінскай мове - квітень і польскай - kwiecie?. У старажытных славян чацвёрты месяц яшчэ вядомы як беразоль. А ў чэхаў гэта duben, у літаўцаў - balandis і г.д.

Рускі апрель (таксама ў англічан, французаў, немцаў) паходзіць ад рымскага aprilis, што азначае "адчыняць". У гэты месяц у Італіі адчыняліся дзверы вясны, распускаліся на дрэвах пупышкі.

Пачатак апрыліса ў рымлян прысвячаўся двум багіням. 4 красавіка распачыналася сямідзённае свята Магалерыя. На ім ўшаноўвалі маці багоў Цыбелі. А свята Цэрэаліі адзначалася ў гонар багіні земляробства Цэрэры, апякункі збожжа і пладоў, маці-карміцелькі ўсіх жывых істот, у тым ліку і людзей. Лічылася, што ад яе пайшла ўсякая культура, якая звязана з земляробствам. "Вынаходніцтвы" земляробства ахвяравалі мёд, малако, збожжа, розныя плады і кветкі.

Трэцім важным святам былі Паліліі. Яны праводзіліся 21 красавіка ў гонар божышча пастухоў Палеса, якраз у дзень заснавання Рыма. Падчас святкавання рымляне асаблівую ўвагу звярталі на жывёлу: ачышчалі яе памяшканне, упрыгожвалі зелянінаю, абкурвалі сераю. У ахвяру Палесу прыносілі малако. Праводзілі абрады ачышчэння: пастухі пераскоквалі цераз кастры з саломы і праганялі праз іх свойскую жывёлу.

Для земляробства настае адказны час: падрыхтоўка насення і выбар аптымальнага дня першага ворыва. На яго сяляне некалі ішлі, як на свята, мыліся ў лазні, апраналіся ва ўсё белае, выконвалі прымеркаваныя да тае нагоды абрады, прытрымліваліся павер`яў.

Надзейнай прыкметай гатоўнасці глебы з`яўлялася наступнае: сціскалі ў жмені невялікі яе камяк і з сілай разбівалі вобзем. Калі рассыпаўся - "засупоньвай хамут". Пачалі жабы крактаць - выходзь у поле. Жаўрук зазвінеў - бяры саху ў рукі. Не без падстаў у народзе было прынята выязджаць у поле пасля першага грому: следам за ім усталёўваліся цёплыя пагодлівыя дзянькі. Вопытныя сейбіты аддавалі даніну павагі традыцыям і больш спадзяваліся на сябе, на веды і ўменні. Кідалі зярняты раўнамерна праз крок, пазбягалі неглыбокага іх загортвання. Тэрмін сяўбы залежаў ад рэгіянальных асаблівасцей, мелі на ўвазе і такое: як цвіце каліна - без ваганняў сей ячмень; сеялі таксама, калі з`яўляліся на елках шышкі чырвоныя, а на соснах зялёныя; з ячменем стараліся ўправіцца да вылету хрушчоў. Пшаніцу сеялі, калі распускалася чаромха, а льном займаліся ў апошнюю чаргу.

Народныя прыкметы дапамагалі селяніну выбраць месца пасеву ў залежнасці ад надвор`я, указвалі на паслядоўнасць вырошчвання культур на розных палетках. Так, калі чакалася сухое лета, то на нізінах высявалі лён і гарох, а на ўзгорках - авёс. Канюшыну сеялі па азімым полі, на папарах -

жыта, пасля яго - ячмень, затым - авёс і грэчку, або ячмень - па бульбе, а лён - на канюшыне, ячмені, цаліне ці залежы і г.д.

6/24. Камаедзіца. Язычніцкае свята пакланення мядзведзю, зафіксаваная ў мінулым стагоддзі на Бягомльшчыне. Вось яго апісанне, зроблена адным з карэспандэнтаў П.Шэйна.

"У гэты дзень гатуюць асобную ежу, менавіта: на першую страву - сушаны рэпнік у гонар таго, што мядзведзь харчуецца пераважна раслінным кормам, травамі; на другое падаецца кісель, бо звер любіць авёс; трэцяя страва складаецца з гарохавых камоў, ад якіх і само свята атрымала назву Камаедзіцы.

Пасля абеду ўсе - і старыя, і малыя - кладуцца адпачываць, але не спяць, а час ад часу пераварочваюцца з боку на бок, нібы мядзведзь у бярлозе. Цырымонія расцягваецца каля дзвюх гадзін - усё робіцца дзеля таго, каб мядзведзь лёгка падняўся пасля зімовага сну. Потым сяляне ўжо не займаюцца сваімі дзённымі справамі, святкуюць. Паводле павер'я, мядзведзь у гэты дзень абуджаецца ад спячкі. Выходзіць са сваёй бярлогі. Вось і сустракаюць яго добразычліва.

Пачатак свята бярэ, без сумнення, ад часоў дахрысціянскіх і служыць верагоднай дакументацыяй таго, што ў дадзенай мясцовасці пакланяліся мядзведзю. Па ўспамінах старажылаў, у гэтым рэгіёне некалі былі магутныя лясы і непраходныя нетры, дзе вялося мноства дзікіх звяроў. Мядзведзь, які вылучаўся сваёй сілаю, ростам, наводзіў страх на людзей. Каб задобрыць яго, людзі і прыдумалі звычай ушаноўваць мядзведзя"(Шейн П.В. Материалы для изучения быта и языка русского населения Северо-Западного края. Т. 3. Спб, 1902.).

Гэты цікавы факт татэмічных вераванняў нашых далёкіх продкаў. Ён не мог падвергнуцца хрысціянізацыі, а таму знік у сілу свайго яўнага язычніцтва.

У Эстоніі мядзведзь меў два дні ў годзе: сярэдзіну зімы (14 студзеня), калі "пераварочваўся на другі бок" і "сярэдзіну лета". З гэтага можна меркаваць, што беларускі цар лясоў "пераварочваўся" менавіта блізка даты вясенняга раўнадзенства. Ля новага года ён мог апынуцца пазней, у хрысціянскі перыяд. Вобраз мядзведзя прысутнічае ў фальклоры многіх народаў: на Грамніцах, Масленіцы, веснавым карнавале, Калядах. Б.Рыбакоў ў беларускіх Камаедзіцах знаходзіць аналогіі грэчаскім "камедыям". "Мядзведзь" быў зверам Артэміды, адпаведна багіні Лады.

У даследчыкаў не ўзнікае сумнення адносна культа мядзведзя як сакральнай жывёлы ў сістэме татэмізма. У міфалагічных уяўленнях народаў свету і рытуале мядзведзь можа выступаць як бажаство (у прыватнасці, якое памірае і адраджаецца), культурны герой, пачынальнік традыцый, продак, родапачынальнік, татэм, дух-ахоўнік, гаспадар ніжняга свету, свяшчэнная і (або) ахвярная жывёла, зааморфны класіфікатар, элемент астральнага коду, увасабленне душы, дарыцель, звярыны двайнік чалавека, памочнік шамана, яго зааморфная іпастась і душа, пярэварэцень і г.д.

У беларускім фальклоры, як і ў вуснай творчасці многіх народаў, мядзведзь лічыўся царом звяроў, асноўным персанажам казак пра жывёл. Міфалагічны вобраз яго добра апісаны А.Ненадаўцам.

Нягледзячы на немалы шэраг кананізаваных імён у царкоўным календары, што адзначаюцца ў гэты дзень, народная традыцыя не вылучыла ніводнае з іх.

7/25. Благавешчанне (Дабравешчанне, Звеставанне). Лічылася вялікім святам, святам прылёту бусла, ластаўкі. Шчасціла нібыта таму, хто ўбачыць першага бусла, які ляціць, а не стаіць. А ў таго, каму трапіць на вока стаячы, нібы будуць балець ногі.

У гэты дзень забаранялася гарадзіць плот, убіваць у зямлю колле, не пачыналі сеў, не выганялі першы раз кароў, не вывозілі гной у поле. Са святам звязана шмат прыкмет: "Дабравешчанне без ластавак - халодная вясна", "Калі пчала не выходзіць з вулля да Дабравешчання, то будзе цёплае, ураджайнае лета, а калі пакажацца раней - то благое, беднае"; прымавак: "На Благавешчанне дзеўка косу не пляце, птушка гнязда не ўе"; забарон: "У гэты дзень не садзяць на яйкі гусей - іначай будуць калекі".

Гаспадыня падымалася раней мужа, каб выканаць абрад "развязвання сахі". Пасля абеду ў многіх раёнах Беларусі "гукалі вясну". Дзяўчаты збіраліся ля гумнаў і лазняў, забіраліся нават на стрэхі і спявалі вяснанкі, што заканчваліся выгукам: "Гу!". Разводзілі невялікія кастры, вадзілі вакол іх "танкі".

На паўднёвым усходзе Беларусі на вясновае свята прымяркоўвалі правядзенне старадаўняга абраду "ваджэння і пахавання стралы" з выхадам у зелянеючае азімае жыта.

Змест народнай традыцыі святкавання Благавешчання не выяўляе сэнс царкоўнага свята Дабравешчання Правятой Багародзіцы, якая ў той дзнь пачула ад Анёла: "Не бойся, Марыя, бо атрымала мілату ад Бога. І вось ты зачнеш ва ўлонні і народзіш Сына, і дасі Яму імя: Ісус". Свята ўпершыню пачалі адзначаць у IV стагоддзі н.э. у Канстанцінопалі.

1. Вербніца (Вербная нядзеля) - нядзеля перад Вялікаднем. Пачатак Вербнага тыдня. У царкве ў суботу асвячалі галінкі маладой вярбы, адзін аднаго сцябалі імі, прыгаворваючы: "Вярба б'е, не я б'ю, за тыдзень - Вялікдзень. Будзь здаровы, як вада, будзь багаты, як зямля!". Галінкі тыя захоўвалі, пашаптаўшы замову, вярбою гналі першы раз кароў на пашу: "Вярба свята - нова лята, вярба пасвіці ў поле гнала".

Адзначэнне хрысціянскай Вербнай нядзелі мае большыя сувязі, чым іншыя святы, з народнымі традыцыямі. Як народная, так і царкоўная традыцыя маюць адзін асноўны сімвал - вярбу.

Згодна з біблейскай гісторыяй, пасля таго як Ісус Хрыстос уваскрасіў з мёртвых у суботу Лазара, Выратавальнік у наступны дзень як Месія (абяцаны Старым Запаветам) уязджае на осліку ў Іерусалім. Напярэдадні іўдзейскай Пасхі ў горадзе было шмат людзей з усёй Палесціны, якія жадалі ўбачыць Памазаніка Божага, які здзіўляў сваёй мудрасцю, прароцтвам і цудамі. Па

даўняй традыцыі радасны і ўсхваляваны народ расцілаў дарогу Ісусу маладымі пальмавымі галінкамі.

5. Чысты (Вялікі) чацвер - чацвер на Вербным тыдні. Дзень звязаны з мыццём: хадзілі мыцца ў лазню, на "бягучую ваду", на расу, каб не было на целе хвароб, клапоў у хаце: "Чысты чацвер вулкі чысце, дваркі мяце, слядкі кладзе... к святому Вялічку".

Аралі і сеялі: "Чысты чацвер ячмень засяваець". У гэты дзень садзілі капусту, каб расла чыстай. Прыкмячалі: як на Чысты чацвер добрае надвор'е, то і на Ушэсце, і на Вялікдзень будзе такое ж. Песень не спявалі, бо працягваўся пост.

Звяртае на сябе ўвагу адноснае багацце язычніцкай традыцыі ў дзень Чыстага чацвярга, які звязаны з рухомым царкоўным календаром. Міжволі ўзнікае думка аб існаванні ў дахрысціянскі перыяд нейкага невядомага нам язычніцкага святкавання, якое ў народнай традыцыі злілося з царкоўным.

Вялікі чацвер - гэта ўспамін аб Тайнай Вячэры, калі праследуемы Хрыстос апошні раз вольна сустракаецца з 12 вучнямі перад здрадай аднаго з іх - Іуды. Іуда Іскарыёт пасля вячэры ў садзе здрадніцкім пацалункам указаў на Ісуса, якога тут жа схапілі стражнікі. Царква ў сваіх песнапеннях і іншых дзеях смуткуе і спачувае Вялікаму Пакутніку і Збавіцелю.

6. Чырвоная (Вялікая) пятніца. Рыхтаваліся да вялікага свята. Згодна Бібліі, гэта дзень, калі быў раскрыжаваны на Галгофе Ісус.

7. Чырвоная (Вялікая) субота - апошні дзень перад Вялікаднем. Пяклі пірагі, фарбавалі яйкі цыбульнікам ці васковымі жамерынамі. Хадзілі на могілкі прыбіраць. Палілі кастры. Усю ноч у хатах гарэла святло. Чырвоная субота - напамінак аб знаходжанні Збавіцеля ў дамавіне.

8. Вялікдзень (Пасха) - вялікае гадавое свята, карані якога вядуць у глыбокую стражытнасць. Ім некалі адкрываўся новы каляндарны год. Пазней царква замацавала яго ў сваім "рухомым" календары. Свята пачынаецца "ўсяночнай". З Чырвонай суботы на нядзелю многія не спалі, на вуліцах гарэлі кастры, чулася стральба, некаторыя шукалі папараць-кветку, у царкве свяцілі пафарбаваныя яйкі, пірагі, мак, хрэн, мяса і інш. Раніцай хадзілі глядзець "гульню" сонца, пафарбаванымі яйкамі гулялі "ў біткі", качалі іх, гушкалі на арэлях, вадзілі карагоды.

Умываліся вадой з чырвоным яйкам. Елі свянцонае. Лічылася, што смерць у светлы дзень, нават для цяжкага грэшніка, святая: ён атрымліваў дараванне грахоў. Лічылася, што на Вялікдзень пачынае кукаваць зязюля.

Адны з яркіх сімвалаў Вялікадня стала яйцо, традыцыя фарбавання якога пачалася амаль адразу пасля Уваскрэсення Хрыстова. Марыя Магдаліна, сведка вялікай падзеі сустрэчы ў Светлую Нядзелю Ісуса на трэці дзень пасля раскрыжавання, прыбегла да імператара Тыберыя ў Рым з чырвоным яйкам і словамі: "Хрыстос уваскрос!". Чырвоны колер - знак божых пакут дзеля людзей.

Але яйцо на хрысціянскую Пасху з`явілася не на пустым месцы і невыпадкова, бо існавала яшчэ глыбейшая язычніцкая традыцыя. У

старажытных міфах народаў свету (Кітай, Егіпет) птушынае вясновае яйцо ўяўляецца як мікракосм, у якім адлюстроўваўся Сусвет.

Традыцыя Пасхі таксама мае больш глыбокія карані. Яна ўстанавілася яшчэ раней самага вялікага хрысціянскага свята. Афіцыйна адзначэнне царкоўнага святкавання пачалося з 525 года, калі на Першым Усяленскім царкоўным саборы ў Нікеі было вырашана ўстанавіць яе ў першую нядзелю пасля вясенняга раўнадзенства (22 сакавіка) і поўні пры ўмове, што яна ніколі ўжо не будзе супадаць з іудзейскай як было дагэтуль.

Слова "пасха" ў перакладзе са старажытнаяўрэйскай мовы ("песах") азначае "прахаджэнне побач", "літасць". Паходжанне значэння слова тлумачаць наступным чынам. У некаторых краінах дахрысціянскага Бліжняга Усходу існаваў культ багоў, адны з якіх паміралі, а іншыя з прыходам вясны адраджаліся. Да гэтага часу неабходна было заплаціць падаткі і ахвяраваць багам жывёліну, пазначаўшы ўваход жылля яе крывёю. Збіральнікі падаткаў такія хаты пакідалі ў літасці, праходзілі побач. Пазней да ахвяравальных знакаў, пасхальнай (велікоднай) сімволікі далучылася і фарбаванае яйцо.

Працяг Велікоднага тыдня. У царкоўным календары - гэта светлая седміца. У панадзелак і аўторак свята працягваецца. У большасці раёнаў Беларусі хадзілі валачобнікі, спявалі песні гаспадару і гаспадыні, дзяўчыне, хлопцу, бабцы. У асобных валачобных песнях у паэтычнай форме паказваецца ўвесь земляробчы каляндар селяніна, які пачынаецца Вялікаднем і якое неабходна лічыць пачаткам году, Новым годам.

З Новым годам і калядаваннем звязваецца валачобніцтва і праз лялькавую скрыню "Ягорый", што насілі некаторыя гурты. Адметны беларускі звычай узнік пад уздзеяннем батлейкі

17. Радаўніца (Радуніца, Провады, Мёртвы дзень, Праводны дзень) - аўторак другога (Фаміного) тыдня пасля Вялікадня, дзень памінання памёршых на могілках. Вядомы ва ўсіх славян. У народзе гавораць; "На Радаўніцу да абеду пашуць, па абеду плачуць, а к вечару скачуць". Рускія на Радаўніцу спраўлялі "вьюнец", за якім спявалі абрадавыя песні ў гонар маладых, якія абвянчаліся на Краснай горцы. Старажытнасць абрада даследыкі бачаць у тым, што пасля памінання і галашэнняў пачыналася шумнае вяслле з песнямі, скокамі, асабліва гэта захавалася на Беларусі і Сібіры. У рытуальным вяселлі і песнях праяўляецца імкненне пераадолення смерці, паралізуючае ўздзеянне на яе, сцвярджальнасць жыцця.

**МАЙ**

Май - жывёлу ў поле пхай.
Май зямлю грэе, а сіверам вее.
Май - валам дай, а сам на печ ўцякай.
Май халодны - год галодны.
Дождж у маі - хлеб будзе і на гультая.
Майская трава галоднага корміць.
Май - і пад кустом рай.

Сучаснай беларускай літаратурнай назве месяца май адпавядае старажытнабеларуская травень, якая паходзіць ад слова "трава", бо ў гэтым пятым месяцы года зямля пакрываецца зеленню. Такое найменне захавалася не толькі ў старажытных пісьмовых крыніцах, але і ў вуснай народнай творчасці. Май - адзіная ў нас назва, узятая з лацінскай мовы. Тая ж лацінская аснова таксама ў нямецкай і французскай мовах - Маі, англійскай - Мау, польскай - maj, венгерскай - majus, рускай - май і інш.

Рымляне прысвяцілі месяц багіні зямлі Маі. У канцы красавіка і пачатку мая яны адзначалі вясёлае свята Фларэлія ў гонар багіні кветак Флоры. У прыватнасці, у першы дзень апошняга месяца вясны быў звычай садзіць дрэва, што называлі "маем". У славян, у тым ліку беларусаў, захаваліся абрады з "маем" на Сёмуху. Падобны ў нас і старажытных рымлян і абрад ушанавання памяці нябожчыкаў. У рымлян ён выконваўся 9 мая.

Католікі прысвячаюць май Божай Маці - Марыі. Штодня ў касцёлах адбываецца так званае маёвае набажэнства. Фігура Багародзіцы ўсюды, дзе яна ўстаноўлена, упрыгожваецца.

Май, працягласць дня ў якім павялічваецца на 1 гадзіну і 42 хвіліны, з`яўляецца найпрыгажэйшай парой года. Цвітуць бяроза, клён, чаромха, наогул усе дрэвы і кусты. Паплавы і паляны пакрываюцца кветкамі. Прырода напаўняецца спевамі птушак, што паспелі ўжо вярнуцца з выраю. З`яўляецца шмат насякомых, майскія жукі захопліваюць зялёналісцевыя дрэвы.

6/23. Георгій (Юр`я, Юрай, Ягор`я). У тым ліку іншых веснавых дзён гэта свята больш чым якое іншае прэтэндуе на сапраўдны пачатак вясны. Менавіта з Юр`я, як лічылі амаль паўсюдна, пачынае кукаваць зязюля. На Юр`я сяляне выходзілі з песнымі і ахвярнымі стравамі аглядаць свае зарунелыя палеткі ("Калі прыйдзе Юры, не ўгледзіш у жыце куры"). З Юр`ем звязваўся, як правіла, і першы выпас жывёлы (запасаў для яе павінна было хапіць як мінімум да гэтага дня - "На Юр`я каб сена было і ў дурня"). Дбайны гаспадар не прапускаў без увагі стан надвор`я і рабіў для сябе пэўныя высновы: "Калі на Ягор`я мароз - будзе добры авёс". Снег на Юр`я падаваў надзею, што ўлетку пабялеюць палі ад удалай, ураджайнай грэчкі, і наадварот, - "Як на Юр`я пагода, то на грэчку няўрода". Густы юр`еўскі дождж упэўніваў селяніна, што вырасце густое вялікае жыта. Жыватворная юр`еўская раса таксама абяцала прыбытак: "Калі будзе раса - хопіць коням аўса".

Галоўнай адказнасцю, якой народ надзяліў святога Юр`я, было апякунства хатняй жывёлы і гаспадаркі. Адначасова Юр`я называлі і валадаром ваўкоў. У народзе ўяўлялі, што ён едзе на белым кані і замыкае пашчы дзікім звярам, пасля чаго тыя менш нападаюць на скаціну. Статак стараліся выгнаць зарань, на цудадзейную расу - яна павінна забяспечыць вялікі дастатак малака. За лепшае лічылі, калі запасванне супадае з поўняю - "каб усяго было поўна". Перад тым як выгнаць жывёлу, гаспадар тройчы абыходзіў яе з запаленай грамнічнай свечкай і апырскваў свянцонаю вадою. Абкурвалі жывёлу падпаленымі купальскімі зёлкамі, якія захоўваліся ў кожнай хаце. Выганялі скаціну з хлява, пасцёбваючы асвячонымі на

Вербніцу галінкамі вярбы, затым яе ўтыкалі ў хляве ад злых духаў. На парозе хлява перад жывёлай клалі розныя сімвалічныя прадметы: курынае яйка - нібыта затым, каб замкнуць ім ваўку пашчу і каб каровы былі круглыя і поўныя, а калі яйка заставалася цэлае пасля праходу жывёлы, спадзяваліся, што і жывёла сёлета будзе цэлая; замкнуты замок пад нагамі худобы - як ахоўны сродак ад ваўкоў ("Няхай так замкнецца яго пашча на ўсё лета"); ніты ад кроснаў - ад укусу змяі ("Як гадзюка ніты не разбярэ, так ад кароўкі малака не адбярэ"); сякеру - каб абараніць ёю гавяду ад "нячыснай сілы" і чарадзеяў, пояс ці жменю выцягнутай са страхі саломы - каб скаціна не адыходзіла ад дому; бязмен - каб жывёла павялічвалася ў вазе.

Запасванне на Юр`я станавілася і святам пастухоў - для іх гаспадары рыхтавалі добрыя закускі, а тыя ўжо на пашы ладзілі пачастунак. У першы дзень пастухі не павінны былі рабіць ніякіх пазык, не бралі яны ў поле агню, нажа (вастрыць яго, першы раз на вясну гонячы статак, значыла б завастрыць ваўку зубы).

Не забываў селянін на Юр`я і пра сваю ніву. Ён выходзіў на яе з загорнутым у абрус караваем, спечаным напярэдадні, - увасабленнем леташняга ўраджаю, абыходзіў палеткі, клаў хлеб у рунь, і калі ён хаваўся ў жыце, казалі, што ў гэтым годзе яно будзе ўдалае. Выносілі ў поле косткі, што захаваліся ад велікоднага стала, і закопвалі па канцах поля. Асвячоная вербачка ўторквалася ў зямлю з вераю, што гэтым самым удасца абараніць ніву ад граду. На полі частаваліся, спявалі юраўскія песні. Ушэсце (Ушэснік, Шоснік) - дзень агляду жыта; чацвер на шостым тыдні пасля Пасхі, саракавы дзень. Згодна з беларускім павер`ем, на Ушэсце з зямлі выходзяць прасушыцца скарбы, але іх ніхто не бачыць. У многіх раёнах святкаваўся як апошні дзень вясны. А на Усходнім Палессі выконвалі абрад "ваджэння і пахавання стралы". Вадзілі веснавыя карагоды, "танок" у полі або абыходзілі вакол вёскі. Гулялі па жыце, закопвалі ў глебу "стралу" (пярсцёнкі, грошы і інш.), каб задобрыць палявога духа на добры ўраджай.

Узнясенне Гасподне з`яўляецца двунадзесятым, гэта значыць у ліку 12 сямейных гадавых святаў. На 40-ы дзень пасля Пасхі Ісус Хрыстос "узняўся на неба" да Бацькі, каб падрыхтаваць масца для людзей.

Сёмушныя (Траецкія, Сярэднія) Дзяды - пятніца перад Сёмухай.

Духавая субота (Стаўрускія Дзяды, Стаўроўскія Дзяды, Сёмуха) - Дзяды ў суботу перад Сёмухай, Тройцай. Звычай памінання продкаў ў гэты час з`яўляецца язычніцкім, аб гэтым сведчыць паданне адзначэння Стаўроўскіх дзядоў і іншыя фальклорныя матэрыялы. Зялёная (Кляновая) субота (Зелянец, Май, Зялёныя святкі) - свята маладой зеляніны перад Сёмухай. Варажылі пра надвор`е. Асвячалі травы, абкурвалі хаты, жывёлу, каб не баялася перуноў.

Увага да зеляніны, а яна з`яўляецца дамінуючай, несумненна, язычніцкая традыцыя. Асвячэнне кветак і зёлак, упрыгожванне "маем" будынкаў і памяшканняў, пляценне і нашэнне вянкоў, дзявочая варажба і іншыя абрадавыя рытуалы, "завіванне бярозак" падчас "кумлення" і абрадавай ежы, прысутнасць раслліннай тэматыкі ў абрадавых песнях - гэта

сведчанні анімістычных уяўленняў нашых продкаў, што ідуць яшчэ з дахрысціянскай пары. Вядомы прымаўкі: "На Святога духа не скідай кажуха", "На Духа будзець цёпла і суха". У гэты дзень садзілі капусту, каноплі. Сёмуха (Сямік, Тройца, Клечанне) - язычніцкае свята, у якім праглядаецца культ продкаў і расліннасці, прымеркаванае пазней царквою да хрысціянскай Пяцідзесятніцы (50-ы дзень пасля Пасхі).

Упрыгожвалі "маем" будынкі. Дзяўчаты хадзілі ў лес "завіваць" бярозкі, плясці вянкі, есці абрадавую страву (яйкі). У некаторых раёнах Палесся называлі гэтае свята Клечаннем, відаць, таму, што галінкамі клёна ўпрыгожвалі хаты.

Дзень святой Тройцы, Пяцідзесятніца - вялікае царкоўнае свята. Уваходзіць у лік асноўных ("двунадзесятых"), адно з дванаццаці, прысвечана памяці даравання Богам Маісею дзесяці запаведзяў, аб спасланні Святога Духа на апосталаў, якія панеслі сведчанне пра ўваскросшага Хрыста. Гэты момант лічыцца нараджэннем царквы, што прызнае трыадзінства, Святую Троіцу: Бог-бацька, Бог-сын і Святы Дух.

Не складзе цяжкасці заўважыць, што сёмушныя традыцыі маюць дахрысціянскае паходжанне, бо не выяўляюць падабенства зместу з хрысціянскай Тройцай, хаця і і ўзнікла яна як свята даволі рана - у 381 годзе, калі на царкоўным саборы ў Канстанцінопалі была прынята ў якасці асноўнага элементу сімвала веры. Найбольшае распаўсюджанне атрымала на нашых землях яшчэ праз стагоддзе, калі была ўключана Сергіем Раданежскім у "рухомы" праваслаўны каляндар і ўдала зліласся з сёмушнымі абрадамі і звычаямі.

Пачатак Русальнага (Граннага, Крывога, Праводнага, Клячальнага, Траецкага, Духавага) тыдня (Русальніца, Брэзжыны, Іван-ды-Мар`я, Духаў дзень) - наступны тыдзень пасля Сёмухі; дні праводзін вясны. Ушаноўваўся культ расліннасці і продкаў. Звычайна на другі дзень Сёмухі на Піншчыне некалі наладжвалі Свята Куста, або вадзілі "куста". "Апраналі" дзяўчыну ў зялёныя галінкі дрэў і вялі па вёсцы з песнямі. Абрады і песні былі скіраваны на садзейнічанне ўрадлівасці зямлі і лепшай долі чалавека. Ва Усходнім Палессі выконвалі праводзіны русалкі ў жыта.

Панядзелак Святога Духа - дзень пасля Пяцідзесятніцы, царкоўнае свята Святога Духа, які згодна біблейскіх уяўленняў, праяўляецца ў людзях, асвячаючы іх, а гэта і з`яўляецца галоўнай мэтай стварэння і выратавання свету.

**ЧЭРВЕНЬ**

Лета на зіму працуе.
Летні дзень за зімовы тыдзень.
Хто ўлетку спіць, той узімку не есць.
Людзі рады лету, а пчолы - квету.
Не прасі лета доўгага, а малі цёплага.
У чэрвені ўбача спадар, што Бог дасць у дар.
Чэрвень не гуляе - ураджай люляе.

Чэрвень - пачатак лета, сярэдні месяц года, мае 30 дзён. Назва яго тлумачыцца з`яўленнем чарвякоў, а таксама чырвоным колерам, які набываюць некаторыя ягады менавіта ў гэтую пару.

Старажытнабеларускае найменне месяца - чирвець (червец), украінскае - червень, польскае - czerwiec, рускае - июнь, лацінскае - junius, нямецкае - Juni, англійскае - June. Назва "юніус" паходзіць ад імя старажытнарымскай багіні Юноны. Згодна іншым звесткам, месяц названы ў гонар першага рымскага консула Юнія Брута.

У месяцы самы доўгі дзень года - 22 чэрвеня (працягласць болей 17 гадзін) і самая кароткая ноч. Сонечныя праменні ў гэты час утвараюць з паверхняй зямлі найбольшы вугал - у Мінску амаль 60 градусаў.

У чэрвені асноўны занятак селяніна - нарыхтоўка сена. Вось якія парады давалі гаспадары на гэты конт: касі траву, пакуль луг не адкрасуе, бо пазней трава зацвярдзее і не будзе з яе карысці для жывёлы; да Пятра высушыш траву пад кустом, а на Пятра не сохне і на кусце. А каб звесці ў хлявах мух, якіх у чэрвені надта многа, рэкамендавалася, напрыклад, прыручыць ластавак, а таксама вешаць на сценах, пад стропам невялікія пучкі папаратніку: мухі садзіліся на зелень, а вечарам іх струшвалі ў мяшкі.

Людзі прыкмячалі: калі ў першы і другі дзень чэрвеня лье дождж - увесь месяц будзе сухі.

3/21. Алёна (Алёна, Ульяна) - дзень ільну. Лічылася, як пасеяць лён на Алёну (Ульяніцу), то добры "удасца". Народныя звычаі і традыцыі добра сумясціліся з імем Алёны, якое даў гэтаму дню царкоўны каляндар. Маці рымскага імператара Канстанціна, які ў 323 годзе аб'явіў хрысціянскую веру пануючай па ўсім валадарстве, прызначана разам з сынам Роўнаапостальнай за заслугі, што прыраўнены да дзеянняў Хрыстовых апосталаў. Яна ў 326 годзе знайшла крыж Гасподні, а таксама рэшткі трох вяшчуноў, што абвясцілі аб святым вялікім нараджэнні, і здзейсніла шмат іншых гістарычных хрысціянскіх учынкаў.

5/23. Дзень памяці Ефрасінні Полацкай (Прадслава) - князёўны, манашкі-асветніцы XII стагоддзя. Прападобная Ефрасіння (1173 г.) - унучка Полацкага князя Усяслава Чарадзея, заснавальніца першых школ і летапісных майстэрняў, нябесная заступніца беларусаў. Па яе замове выраблены Святы Крыж, нацыянальная рэліквія Беларусі.

7. Дзевятнік - чацвер на дзевятым тыдні пасля Вялікадня. Не працавалі ў полі, засцерагаліся грому. Дзевятнік - народная назва свята. Яна ўзнікла ў канцы XIX стагоддзя ў гонар пераводу беларускіх уніятаў пад лона праваслаўнай царквы. Каталікі і уніяты адзначалі яго як свята Божага Цела.

8. Дзевятуха - пятніца на дзевятым тыдні пасля Вялікадня.

14.Дзесятнік - чацвер на дзесятым тыдні ад Вялікадня, адзін з этапаў даспявання жыта ("Дзесятнік гнаі возіць, Дзесятуха косы точыць").

15. Дзесятка (Дзесятуха, Дзесятуха Мучаніца) - пятніца на дзесятым тыдні пасля Вялікадня; адзін з этапаў даспявання жыта ("Дзесятка - жыту

пятка", "Дзесятуха зярно поўніць"). Засцерагаліся маланкі і грому, не працавалі.

20-21. Дзень астанамічнага сонцастаяння.

Пятро і Паўла (Пятрок). Земляробчае свята, якое характарызуюць наступныя прыказкі і прыкметы: "Святы Пётра ў косы звоніць, а святы Паўла граблі робіць", "Прыйшоў Пятрок - апаў лісток, прыйдзе Ілля ападуць і два, а па Усіх Святых - не будзе іх ".

**ЛІПЕНЬ**

Ліпень пякучы, але даручы.
Ліпень косіць і жне, доўга спаць не дае.
Хто ў ліпені на полі пацее, таго ўзімку печка грэе.
У ліпені з касой мужык, а баба з сярпом, але ў хаце ладком.
Ліпень што спаліць агнямі, тое салье дажджамі.

Сучасная беларуская назва сярэдняга, самага спякотнага месяца лета паходзіць ад слова "ліпа". (Дрэва цвіце менавіта ў гэтую пару.) Найменне мае падабенства з польскім lipiec і ўкраінскім липень. У старабеларусіх крыніцах акрамя назвы липець сустракаецца яшчэ чирвець, што захавалася дагэтуль, напрыклад, у чэшскай, славацкай і беларускай мовах (чэрвень) у папярэднім месяцы.

Рымляне да 44 года называлі месяц проста пятым (quintiles), паколькі год пачынаўся з сакавіка. Затым з прычыны трагічнай смерці Юлія Цэзара перайменавалі квінтыліс у юліус (julius), таму і захаваліся juillet - у французаў, Juli - у немцаў, July - у англічан, июль - у рускіх.

У гэтым месяцы старажытныя грэкі адзначалі чатырохдзённае свята Панафінеяў у гонар багіні мудрасці Афіны (рымляне называлі яе Мінервай). Падчас вялікага святкавання адбываліся ўрачыстыя працэсіі, розныя народныя гульні (барацьба атлетаў, гімнастычныя практыкаванні), спевы, танцы.

Ліпень - самы дажджлівы месяц года, палова дзён яго бывае з ападкамі, вызначаецца недобранадзейнасцю надвор`я і асабліва ліўнямі. Здараецца і сухая пара. У народзе прыкмячалі: калі паспелі чарніцы, то паспела і жыта. Ліпень дорыць чалавеку спелыя лясныя і садовыя ягады, першыя грыбы.

6/23. Купала (Купалле) - старажытнае абрадавае свята сонца і агню, боствaў урадлівасці і росквіту зямлі. Прымяркоўвалася да летняга сонцастаяння. "Дзень адбаўляецца, ноч прыбаўляецца", - кажуць у народзе, і нездарма захаваўся звычай наглядаць за свяцілам як "сонца грэе". "Сёння Купала, заўтра Іван...", - гаворыцца ў песнях. Гэтыя і іншыя факты даюць падставу сцвярджаць, што Купала - язычніцкае свята, да якога прыстасавана пазней святкаванне царквою (у другі дзень, 24 чэрвеня) "Рождество честного славного Пророка, предтечи и Крестителя Господня Иоанна". Язычніцкае Купала ўпамінаецца ў летапісах 1175 года.

У некаторых рэгіёнах Беларусі гэты дзень звязваюць з Агрыпінай і свята называюць Агрыпінай Купальніцай, што памерла ў 253-260 годзе.

Дзень пачынаўся ў нашых продкаў з наведвання лазні, дзе адным з купальных атрыбутаў быў люцік, празваны купальніцай.

Дзяўчаты збіралі кветкі для вянкоў, лекавыя зёлкі дзеля прыгатавання лекаў і варажбы, якая нагадвала таемную забаву. Дзяўчаты з вянкамі вадзілі карагоды ля вогнішча, затым купаліся на зары і пускалі вянкі ў ваду, наглядаючы за іх рухам, у якім імкнуліся разгадаць свой лёс. З гэтай прычыны таксама ўтыкалі палявыя кветкі і зёлкі ў шчыліны сцен будынкаў.

Асноўнай купальскай кветкай лічыцца папараць-кветка, якая згодна легендзе зацвітае апоўначы на свята і якую адпраўляюцца шукаць. Хлопцы пад вечар сцягвалі старыя рэчы, галлё для вогнішча. Месца для яго часцей выбіралася на высокім беразе ракі ці возера, на паляне, каля жыта. Праводзілі абрад здабывання жывога агню - церлі асінавыя палкі. "Сягоння ў нас Купала, сам Бог агонь расклаў", - спявалі ўдзельнікі свята. Палівам для кастра таксама служылі дровы з дуба - сімвалічнага дрэва Перуна, што бачна з купальскіх песень: "Пажарам дуб`е гарэла...", "Гарэла дуброва, гарэла..." і інш.

У купальскіх песнях распавядаецца, што "не дзеўка агонь клала, сам Бог агонь раскладаў", "святое Пятро ў поле ходзіць, святы Купала агонь кладзе", "ой, месяцу, месяцу, узыдзі раненька і раскладзі купалейка". Галавешкай ад кастра можна было выгнаць ведзьму з жыта і прагнаць іншую пачварную сілу.

Над купальскім вогнішчам высока на жэрдцы ўздымалі запаленае кола. Звычайна яго бралі са старога воза, прасмальвалі або аблівалі дзёгцем, каб ярка гарэла. Згарэла адно - ладзілі другое. Вакол купальскага кастра вадзілі гульнёвыя карагоды, спявалі песні. Палаючае кола таксама пускалі ўніз з узгорка.

Песнямі суправаджаліся абрады на свяце, карагоды і гульні, завадатарамі якіх з`яўлялася Купалінка і Купаліш. Ля вогнішча ўсе частаваліся абрадавай стравай, моладзь пераскоквала цераз агонь - ён лічыўся ачышчальным ад злых духаў. Спальванне прасмаленых колаў на шчасце, ці спусканне іх, палаючых, з гары - адгалоскі пакланеня свяцілу ("А на гарэ калясо, гарыць яно харошо...").

У звычаях скакання цераз вогнішча, а таксама кідання галавешак у жыта (адпалохванне ведзьмаў), спальвання сарочак хворых дзяцей праглядваецца акт, які носіць ахоўна-ачышчальны абрадавы сэнс. Моладзь скача цераз агонь з перакананнем, што русалкі не будуць нападаць і прыходзіць даіць кароў, каб ачысціць сябе і засцерагчы ад хвароб, чараў.

7/24. Іван Купала (Іван Купальны, Іван, Пятроўскі Іван, Іван Летні, Іван Вялікі, Іван Посны, Іван Злосны, Іван Ведзьмін, Ян). Працяг купальскага свята, якое доўжылася ўсю папярэднюю ноч. "Учора была Купала, а сёння Іван...", - спяваецца ў народнай песні. "На Пятроўскага Івана павінны быць гуркі ў мужыка, не толькі ў пана", - распавядае даўняя прыкмета.

Купальская пара - момант, дзе найбольш удала зліліся дзве традыцыі (язычніцкая і хрысціянская). Другі дзень больш адпавядае царкоўным звычаям, бо адзначаецца нараджэнне Іаана Хрысціцеля.

Бяздзетнаму святару Захарыю, што жыў у Хаўроне (Іудзейскія горы), аднойчы архангел Гаўрыіл паведаміў, што яго жонка Елісавета народзіць сына, якога неабходна назваць Іаанам і які затым многіх з сыноў Ізраілевых паверне да Госпада Бога. Анямелы за сваё сумненне Захарый загаварыў на восьмы тыдзень нараджэння Прадцечы, калі даў імя яму, як і прадказвалася - Іаан, што значыла "дар Божы". Іаан Хрысціцель прадказаў прыход Месіі - Ісуса Хрыста і прапаведаваў яго вучэнне. Ён распачаў абрад хрышчэння (мыцця) у вадаёмах і прынімаў хрышчэнне ў Іардане ў самога Ісуса Хрыста.

Абрад з вадою супаў з язычніцкім купаннем у расе і вадзе, у якой, як лічалася, само сонца купалася.

12/29. Пятро (Пятроў дзень, Пятро-Павел, Пятрок, Паўлюк, Павел, Пятра). Старадаўняе земляробчае свята, па сутнасці завяршэнне Купалля. Селянін заўважаў: "Святы Пятро - у жыце ядро", "Пятрок у касу звоніць", "Калі высыплецца ячмень, зязюля падавіцца зернем і больш не кукуе". Вядома, што зязюля куе ад Магдалены два Пятра ці Купалы, калі і заканчваюцца гулянні моладзі.

Дзяўчаты хадзілі ў лес "развіваць вянкі", якія былі "завіты" імі на Сёмуху, "кумаваліся" (выбіралі сяброўку на год). Палілі кастры, елі абрадавыя стравы, гушкаліся на арэлях, спявалі пятроўскія песні:

Пятрова ночка маленька,
Не выспалася паненка
На новым ганку седзячы,
Міламу кашульку шыючы...

Лічылася, што пасля Пятра лета ідзе на спад. "Прыйшоў Пятрок - апаў лісток", "Пётр і Павел на гадзіну дзень убавіў, Ілля-прарок два ўвалок". Заканчваўся Пятроў пост.

Пра Пятра і Паўла таксама хадзіла нямала легенд і казак, у якіх святыя паказваюцца ў выглядзе простых сялян. Гэта гаворыць аб папулярнасці першавярхоўных апосталаў, якія не былі звязаны адзін з адным у жыцці, але былі пакараны смерцю ў адзін дзень, як самаадданыя праведнікі Хрыста па загаду імператара Нерона каля 67 года. На хрысціянскіх абразах іх часта паказваюць разам, а ў народным календары яны наогул зліліся ў адзін вобраз ("Пятро-Павел").

14/1. Кузьма і Дзям`ян (Касьма і Даміан, Кузьма Сякач). Свята кавалёў. "У дзень святога Касьмы і Даміана кузні не куюць і бабы не п`юць". Песню "Кузьма" спявалі тым, хто вянчаецца першы раз (не выконвалі ўдовам і ўдаўцам):

Скуй нам свадзебку,
Свадзебку крэпкую,
Даўгавечную,
На векі неразлучную...

Кузьма і Дзям`ян вядомы і як апекуны земляробства. "Кузьма сярпы зубіў, ідзя згубіў", "На Кузьму і Дзям`яна касіць ня рана", "Святы Пятро жыта спеліць, святы Кузьма сярпы робіць, а святы Дзям`ян сена грабіць".

17/4. Андрэй (Андрэй Наліва). Адзін з апекуноў земляробства, пра яго пяецца:

Трэці празнік - святы Андрэй,
Святы Андрэй, за ўсіх мудрэй,
Саху ладзіць, каня гладзіць...

Да Андрэя завяршаўся працэс выспявання жыта. Аб гэтым народная мудрасць сцвярджае: "На Андрэя азімыя наліліся, а татка-авёс да палавіны дарос", "Авёс у світцы, а на грэчцы і кашулі няма", "Зерне ў каласку, не валяйся ў халадку".

21/8. Градавы дзень (Казанская). Засцерагаў ад нябесных стыхій, ад хвароб вачэй і галавы. У некаторых раёнах пачыналі касіць, праводзіць зажынкі. Гаварылі: "У дзень Казанскай увесь чарвец збіраецца пад адзін куст". Назву Казанская прысвятку даў праваслаўны каляндар, які адзначае з`яўленне Казанскай Божай маці (1579 г.), усталяваны пасля заваявання ў 1522 годзе Іванам IV Казані.

Ганна. Народ прыкмячаў: "Дождж на Якуба - для жалудоў згуба, а як Ганна з дажджом - дык гарэх з чарвяком", "Святая Ганна снапы кладзе", "Святая Ганна раніцы халодзіць. Калі на Ганну раніца халодная, то зіма будзе ранняя і халодная".

## ЖНІВЕНЬ

Кожная хата ў жніўні багата.
Прыдатны красавік цяплом, а жнівень дабром.
Жнівень сее, жне і косіць - на сталах багацця досыць.
Што поле ўродзіць, жнівень знаходзіць.
Хто ў жніўні гуляе, той узімку галадае.
У жніўні і верабей піва варыць.

Сучасная беларуская назва восьмага месяца года жнівень, таксама як і старабеларускія серпень, зарев, адлюстроўвае прыродныя асаблівасці пары. Дарэчы, найменне серпень захавалася ў украінцаў, чэхаў (srpen), палякаў (sierpien), іншых народаў.

Рымляне называлі гэты месяц sehstylis, што значыць шосты (год пачынаўся тады вясною). Пазней рымскі сенат перайменаваў яго ў гонар імператара Актавіяна Аўгуста. Секстыліс налічваў 29 дзён, а аўгустус стаў мець 31. Заканадаўчы орган, аднолькава паважаючы Юліяна Цэзара і Актавіяна Аўгуста, зрабіў і аднолькава доўгімі месяцы, якія стаяць побач у годзе. Класічная назва месяца захавалася ў многіх заходнееўрапейскіх мовах, а таксама і ў рускай.

Жнівень дае знаць, што заканчваецца лета і набліжаецца восень. Ночы становяцца халаднейшымі, даўжэйшымі і цямнейшымі. Раніцай з'яўляюцца туманы.

Яшчэ ў пачатку месяца заканчваецца ўборка азімых, затым убіраюцца пшаніца, ячмень, авёс, грэчка, проса, лён-даўгунец, скараспелая бульба,

іншая гародніна і садавіна. Людзі карыстаюцца і багатымі дарамі лесу. Таксама вядзецца сяўба азімых, касавіца атавы.

2/20. Ілля (Галляш). Апякун земляробства і абаронца ад нячыстай сілы, які ўвабраў у сябе рысы язычніцкага бога Перуна. Свята дажджоў і навальніц. Успрымацца як канец лета і пачатак восені: "Прыйшоў Пятрок - сарваў лісток, прыйшоў Ілля - сарваў два", "Ілля нарабіў гнілля", "На Іллю да абеда лета, а пасля абеда восень", "Ілля ваюе з чартамі, іх б'е перунамі", "Ілля пытае, ці гатова ралля, а Успенне, ці гатова насенне", "На святога Галляша з новых круп каша".

Заканчвалі касавіцу, хадзілі талакою касіць удовам. Праводзілі зажынкі - свята пачатку жніва. Часта ўспамінацца Ілля ў песнях, якія спяваліся на Каляды.

Жнівеньскія ліўні з бясконцымі маланкамі празвалі "рабінавымі днямі (начамі)", якія часцей пачыналіся на Іллю. Існуе павер'е ў народзе аб громе. Грыміць таму, што Ілля (Пярун) грукаціць на калясніцы па хмарах і кідае маланкі-стрэлы ў нячыстую сілу, якая можа ператварацца ў розных звяроў, каб выратавацца. У прыродзе сапраўды пасля сонцастаяння (Купалы, Пятра) назіраюцца змены надвор'я як перамога Іллі над Пятром. З гэтымі міфамі, мусіць, і звязана даўняя завядзёнка паляўнічых пачынаць адстрэл звяроў.

Народнае ўяўленне, што праяўляецца ў свяце Іллі, цесна звязана з біблейскай гісторыяй аб прароку Іллі, які нарадзіўся ў Фесвіі Галаадскай яшчэ за 900 год да хрысціянства. Ілля (у перакладзе з яўрэйскага "апора Божая") перад паганскімі жрацамі і ізраільскім народам, які перастаў верыць у Адзінага і ад таго тры гады была засуха, запаліў агнём з неба мокры ахвяравальнік, што не змаглі зрабіць жрацы са сваімі багамі. Пасля гэтага язычнікі ўверавалі ў адзінага Бога, жрацы былі забіты, а народ пасля малітвы прарока атрымаў доўгачаканы і жыццядайны дождж. За гэты і іншыя цуды Ілля па Божай волі ўзляцеў на неба на вогненнай калясніцы. Гэты факт, як мяркуюць даследчыкі, дапамог вобразу атрымаць адпаведныя рысы язычніцкага грамаўніка (не толькі Перуна, але і Зеўса).

14/1. Макавей (Макава, Макаўе, Першы Спас, Спас Мядовік, Медзяны Спас). Свята маку і мёду. Праводзілі абрады з макам, ужывалі ў ежу, рабілі варэнікі з мёдам, а таксама елі тое, у што можна было макаць. Асвячалі ваду, зёлкі, садовыя кветкі, моркву, сланечнік. Елі пірагі з макам і морквaю. Ведалі: на Макавея трэба ўволю наесціся маку. Варажылі: "Макавею, Макавею, я на цябе канапелькі сею. Скажы мне, Макавею, дзе мая пара, каб я з ім у гэтую ноч канапельку брала". Пчалаводы правяралі пчол, "макалі ў мёд нажы". Для збору мёду ўсе апраналіся па-святочнаму. Хаця і частаваліся перад асноўнай падзеяй, але без гарэлкі і закускі з рэзкім пахам. Раней запальвалі дымар "жывым агнём", выкарыстоўвалі свянцоную ваду. У гэты дзень надавалася вялікая роля і вадзе, праводзілі "вадзяную аправу" - крыжовае шэсце да вадаёма.

Існавалі прыкметы: "Як на Юр'я дождж - будзе рыбы многа, а на Макава - будзе многа грыбоў", "Калі на Макаўе не бывае дажджу, то будзе шмат пажараў".

Свята ўсебакова адлюстравана ў народнай творчасці. У валачобных песнях зазначаецца: калі Ілля "жыта зажынаіць залатым сярпом", то "Святы Макавей з поля сабіраіць". Прыказкі сцвярджаюць: "Першы Спас - провады лета", "Ад Першага Спаса халодныя росы".

Спасаўка (Спасаўка Ласаўка). Пятнаццацідзённы асенні пост (да 28 жніўня).

15/2. Прачыстая (Першая Прачыстая, Першы святок, Зельная). У каталіцкім календары - Унебаўзяцце (Успенне) Божай Маці (уведзена ў VII стагоддзі). Існуе шмат прыказак і прыкмет на гэты дзень: "Прыйшла Прачыста - стала поле чыста", "Зельная Божая Маці ўсяго можа нам даці", "Да святка араць - лішнюю капу нажаць", "Прачыстая прынясе хлеба чыстага", "Першы Святок і першы світок". Свенцяць зёлкі, кветкі, садавіну, збожжа, што лічацца гаючымі і аберагаючымі.

19/6. Яблычны Спас (Спас, Другі Спас, Вялікі Спас, Сярэдні Спас). Свята садавіны, якую асвячаюць, пасля чаго дазвалялася есці яблыкі, бо яны лічыліся грэшнымі пладамі. Згодна Бібліі, змей-спакушальнік праз яблык зрабіў грэшнай Еву. Таму першыя плады неабходна было асвяціць у дзень Пераўтварэння Госпада Бога і Спаса нашага Ісуса Хрыста. Асвячалі таксама мёд, каласкі новага ўраджаю. Усё можна было ўжываць у ежу, аб чым і сцвярджала прыказка: "Спас - усяму час". Пачыналі сеяць азіміну. Наогул лічыцца, што ўжо скончылася лета: "Першы і Другі Спас - бяры рукавіцы ў запас".

Царкоўнае святкаванне звязана з біблейскімі падзеямі. Ісус Хрыстос збіраўся апошні раз з'явіцца ў Іерусаліме. На гары Фавор яго вучні ўбачылі нечакана пераўтворанага Ісуса (у белым адзенні, асветлены сонцам твар) і пачулі нябесны голас: "Гэта і ёсць Сын Мой Любімы, у Якім мая добрая воля, Яго слухайце". Значэнне пераўтварэння ў тым, што Хрыстос паказаны не як адзін з роўных апосталаў, а які стаіць над імі.

28/15. Прачыстая (Успенне, Багародзіца, Першая Прачыстая, Вялікая Прачыстая, Гаспажа, Зялёная, Зельная). Свята ўраджаю і падрыхтоўкі да сяўбы. Асвячалі "бараду" - апошні снапок, зернем якога пасля Прачыстай пачыналі засеўкі, а таксама зёлкі і гародніну. Наладжвалі Свята Свечкі: пераносілі яе з адной хаты ў другую, гасцявалі. На Палессі ўпраўляліся з просам і ў гэты ж дзень варылі з яго кашу. Наглядалі за буслямі, што на зжатых палетках збіраліся ў вырай.

Амаль паўсюдна вядомы прыказкі: "Прыйшла Прачыстая - стала поле чыстае", "Прачыста - сяўба чыста, а касьба не чыста". Менш распаўсюджаны наступныя: "Гаспажа - хлеба дзяжа", "Надышло Успенне - цягні бульбу за карэнне".

Як вынікае з фальклорных матэрыялаў, засеўкі, што праводзілі звычайна пасля Прачыстай, з'яўляліся вельмі важным этапам у земляробчым календары беларускага сялянства. Фалькларыстамі мінулага зафіксавана вялікая колькасць звычаяў, абрада і павер'яў, што датычаць гэтага моманту, ад якога ў многім залежаў будучы ўраджай. Тут, як і ў іншых вялікіх святах, добра перапляліся старадаўнія язычніцкія і хрысціянскія традыцыі. Першыя

звязаны з такімі магічнымі атрыбутамі, як "поўня", "яйка", "сякера", "ахвяраванне зямлі", "сустрэча", "чысціня" і іншымі, што суправаджаюцца living рознымі і шматлікімі павер'ямі, другія - з асвечаным зернем, малітвай. Даследчыкі выказваюць думку, што 15 жніўня (па ст. ст.) можна лічыць агульнаславянскім святам ураджаю. Царква прынцыпова наладжвала ў гэты дзень асвячэнне семяннога зерня, без якога нельга было пачынаць сяўбу. Гэтая акалічнасць вельмі паўплывала на народныя традыцыі. Такім чынам хрысціянская царква адзначыла Дзень смерці - Успенне Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі, душу якой без пакут прыняў у царства нябеснае Гасподзь Ісус.

29/16. Трэці Спас (Малы Спас, Хлебны Спас, Арэхавы Спас). Адно са свят хлеба. Шмат дзе спраўлялі дажынкі - свята канца жніва. Упрыгожвалі стужкамі і кветкамі "бараду". Ахвяравалі хлеб і соль духу нівы, відаць Воласу, казлападобнай істоце. "Воласаву бародку" жнеі неслі гаспадару і ставілі ў кут. Зерне і каласкі ўжывалі на працягу ўсяго года ў розных магічных абрадах. Канец жніва і змена надвор'я адлюстраваны ў прыказках: "Трэці Спас хлеба прыпас", "Па Трэцім Спасе трымай рукавіцы ў запасе".

31/18. Арабінавыя дзень і ноч (Варавіты дзень). Пара, калі бывае "сухая" навальніца або буран цэлую ноч (дзень). У гэты час нічога не рабілі і чакалі з трывогай грому, маланкі і дажджу, засцерагаліся ад няшчасця. Як ужо згадвалася, "рабінавую ноч" яшчэ звязвалі са Спасаўкай.

## ВЕРАСЕНЬ

Халодны верасень, але сыты.
Верасень - з досвіткам дзень.
У верасні і ліст на дрэве не трымаецца.
У верасні адна ягада, дый то горкая рабіна.
Як настане верасень - гаспадарам поўна гумно і кішэнь.

Вресень, руин, риень, зарев - гэтым старабеларускім найменням дзевятага месяца года адпавядае сучаснае беларускае верасень, што паходзіць ад слова "верас" (менавіта ў гэты час расліна пачынае красаваць). Ва ўкраінскай мове першы месяц восені таксама вересень, у чэшскай - zari, польскай - wrzesien. У англічан, французаў і немцаў - варыянты рымскага september.

Рымскі september меў 29 дзён (адзін дзень дадаў Юлій Цэзар у 46 годзе). Рымляне прысвячалі яго Вулкану, богу агню, і святкавалі Вулканаліі, забіваючы ў ахвяру парася і цяля.

У старажытных грэкаў на працягу дзевяці дзён адбываліся "містэрыі", таемныя культы. У іх прымалі ўдзел толькі пасвячоныя, якія рабілі ахвяры з захаваннем асаблівых абрадаў. Паказваліся ўдзельнікам абразы багоў і знакі-сімвалы, што да гэтага часу старанна ўтойваліся.

Неспрыяльныя ўмовы надвор'я верасня - выпадкі частых дажджоў, ранніх замаразкаў, вялікіх вятроў. Сяляне стараюцца ўбраць бульбу, гародніну і садавіну.

Дрэвы мяняюць сваю афарбоўку, каб пазней засвоіць сонечную энергію: чырвонае, карычневае, пунсовае і жоўтае лісце робіць гэта лепш, чым зялёнае. Пасля першых замаразкаў, звычайна тое назіраецца ў сярэдзіне месяца, пачынаецца лістапад.

Шматгадовыя назіранні за звялай прыродай і паводзінамі жывёлы адлюстраваны ў мудрых народных прыкметах. Каток-вуркаток вымываецца і сцены шкрабае - на непагадзь, а на спіне качаецца - на добрае надвор'е. Імклівыя павучкі па хованках разбягаюцца - непагадзь наступае. Плятуць свае красёнцы павукі ў паўднёвым напрамку - пацяплее, а ў паўночным - пахаладае. Цецярукі на верхалінах дрэў расселіся - на яснае надвор'е. Воблакі цягнуцца з поўначы на поўдзень - на сонечнае надвор'е, а наадварот - чакай непагадзь. Вераснёўскія перуны абяцаюць цёплую восень. Тлушчам пер'е ў гусей, качак і курэй пакрываецца - халады набліжаюцца. Воблакі нізка сцелюцца - чакай халадоў. Туманы на зямлю прылягаюць - пацяплее хутка. Калі лісты на дрэвах моцна трымаюцца - абавязкова чакай позняй зімы.

11/29. Калінавік (Іван Калінавік, Ян, Галавасек, Іван Крываўнік, Галаварэз). Назва замацавалася ад царкоўнага наймення дня - "Адсячэнне галавы Прарока, Прадцечы і Хрысціцеля Гасподня Іаана". У народзе ўсталяваліся за ім бытавыя прыкметы і павер'і. Лічылася, што нельга рэзаць, сячы круглае (капуста, бульба і г.д.) і нават есці. Пчаляры "падглядалі" мёд. На Магілёўшчыне прыкмячалі: калі пасеяць у гэты дзень жыта, то будзе ўраджай "умалотны". На Усходнім Палессі стараліся завяршыць сяўбу абавязкова за дзень, а вечарам дзяўчаты выходзілі віць вянкі, спявалі песні. На Калінавіка збіралі ягады каліны, журавіны выкарыстоўвалі ад боляў галавы.

Настаў час руплівай працы ў полі - збору ўраджаю, калі дождж ужо не патрэбен. У народзе гаварылі: "Да Яна прасіце, дзеткі, дажджу, а па Яне я й адзін упрашу". З Калінавіка да Багача, Пакрова (у розных раёнах па-свойму) гэтая пара называлася Бабіна лета - пачатак жаночых сельскагаспадарчых работ. Гавораць: "Ян па лета прыйшоў, а ўжо восень знайшоў". Пачыналіся сялянскія вяселлі, асабліва пасля Івана Пакроўнага, Пакрова да Піліпаўкі.

Ой, на гарэ ячмень жала,
Снапоў не вязала,
Каго верна любіла,
Праўды не казала.

Бабіна лета. У некаторых раёнах пачатак лета лічыўся пачаткам Бабінага (Бабскага) лета. Прыбіралі агароды, сушылі і апрацоўвалі лён і каноплі.

З гэтай назвай асацыіруюцца наступныя паняцці і характарыстыкі: апошняя сонечная цеплыня, лётанне павуціння, асаблівая пара жаночых сельскагаспадарчых работ, кароткае "лета".

Маецца і навуковае тлумачэнне гэтай з'яве, як першага асенняга перыяду з устойлівым антыцыклічным надвор'ем, калі начное астыванне

глебы і паветра яшчэ не вельмі моцнае, а дзённы прагрэў, хоць і адчувальны, але не такі, каб успрымаўся як спякота. Звычайна такі перыяд пачынаецца пасля асенняга раўнадзенства, 22-23 верасня, і працягваецца адзін-два тыдні. Зямля паварочваецца да Сонца паўднёвым паўшар'ем і пасылае развітальнае цяпло на зямлю.

21/8. Багач (Багатнік, Багатуха, Гаспожка Багатая, Малая Прачыста, Другая Багародзіца, Другая Прачыста, Другая Спажа, Другі святок, Нараджэнне Божае Маці, Зельная). Старажытнае свята заканчэння ўборкі зернавых, водгук язычніцкага свята земляробчага культу бога сонца, бога дастатку і багацтва. Гэтае бажаство ганаравалася і ў іншыя дні, якія стаяць блізка да асенняга раўнадзенства. У некаторых раёнах лічылася першым днём восені. Гаварылі: "Другі святок - восень, браток". Цяпер прымеркавана да Ражаства Багародзіцы (у праваслаўных), Дзевы Марыі (у католікаў).

Багачом або багацтвам называлі таксама кошык з жытам і свечкаю. Яго на свята насілі ў кожную хату і адрыну. Зерне ў кошык збіралі з першага зажыначнага снапа, свечку рыхтавалі пад спеў дажынкавых мелодый. Згодна павер'ям, багач забяспечваў сям'і дабрабыт і шчасце. Адно з вядучых месц займаў святар у свяце, якое на хрысціянскі манер называлі Святам Свечкі. Падобныя святкаванні праводзілі і ў іншыя дні календара.

27/14. Звіжанне (Уздзвіжанне, Хрыст, Часнэйка). Свята "закрывання" зямлі на зіму, якое звязана з вужамі і мае значэнне "руху". Лічылася, што сонца і прырода "грае, здзвігаецца", "іграе і дрыжыць" усімі колерамі. "На Узвіжанне халат з плеч, а кажух на плечы"; "К Звіжанню ўсё далжно быць здзвінута - гэта значыць увесь хлеб азімы і яравы павінен быць звезены з поля"; "Дзвіжанне - гадзюкі здзвігаюцца ў кучу". У гэты дзень не хадзілі у лес, бо там нібы гадзюкі і вужы збіраліся ў клубкі, каб схавацца ў норы на зіму. Існуе легенда, што ў цара гадзюк на галаве ёсць залатыя рожкі. Трэба раніцай на Звіжанне ўпільнаваць, калі будзе грэцца на сонцы клубок гадзюк з царом і ўдарыць па ім адзін раз - схапіць рожкі і збегчы. Лічыцца, што такая карона здымае ўсе замкі і запоры. Лоўка ёю карыстацца зладзеям. Загаварвалі кароў ад гадзюкі.

Увесь тыдзень ("свістун") не сеялі, каб не было пустога калосся. Гэты дзень называлі "Часнэйка", таму што ўпершыню пасля Вялікадня дазвалялася паесці часныку той сям'і, у хаце якой быў нябожчык. У назіраннях за прыродай значная роля адводзіцца птушкам, якія забіралі з сабой лета. "Узвіжанне - апошні воз з поля рушыў, а птушкі ў вырай пацягнуліся"; "Узвіжанне лета замыкае, ключык шызая галачка за мора панесла".

Можна меркаваць аб тым, што ў дахрысціянскі перыяд нашы продкі ў асеннюю пару займаліся магіяй супраць гадзюк, бо нямала слядоў гэтага засталося ў фальклоры. Даследчыкі лічаць, што змяіныя святы славян (яшчэ 7 красавіка) бяруць пачатак з верхняга палеаліту.

Зыходзячы з фальклорнага матэрыялу можна меркаваць, што хрысціянскае значэнне свята беларусам не было зразумела і асацыяцыя са словам "рух" (здвиг) узнікла ў хрысціянскі перыяд. А ён прынёс свята людзям 13 верасня 355 года, калі быў асвечаны ў Канстанцінопалі храм у

гонар Уваскрашэння Хрыстова на месцы знішчэння язычніцкага капішча, пад якім былі знойдзены Труна і Крыж Гасподні і ўстаноўлены ("воздвигнуты") на радасць хрысціян. У наступны дзень і сталі адзначаць свята Устанаўлення Чэснага і Жыватворнага Крыжа Гасподняга.

**КАСТРЫЧНІК**

У кастрычніку і хата з дрывамі, і мужык з лапцямі.
Кастрычнік ходзіць па краю і гоніць птушак з гаю.
Кастрычнік ні калёс, ні палоз не любіць.
Кастрычнік зямлю беліць, а лес дык залоціць.

Кастрычнік - дзесяты месяц года. Старaславянскія назвы яго - листапад, риень, паздерник, бруденъ; у сербаў - паздзернік, у палякаў - pazdziernik, ва ўкраінцаў - жовтень. Беларускае найменне месяца паходзіць ад слова "кастрыца": у гэты час сяляне трапалі, часалі лён і каноплі, з якіх ападала шмат кастрыцы.

У рымлян october (такая ж аснова ў нямецкай, французскай, англійскай, рускай мовах) быў прысвечаны богу вайны Марсу. У 15-ы дзень месяца прыносілі ў ахвяру каня, які вылучаўся на папярэдніх скачках. Другога кастрычніка святкавалі Медэтрыналіі ў гонар багіні медыцыны Медэтрыны. Кожны рымлянін гатаваў сабе багаты стол і стараўся як мала больш наесціся і напіцца, бо гэта нібы перасцерагала яго ў будучым ад розных хвароб.

Старажытныя грэкі ўшаноўвалі бога вінаробства Бахуса (Дыяніса). Свята было вельмі вясёлым і свабодным, у ім нароўні з вольнымі грэкамі прымалі ўдзел і рабы. Адмысловы хор пры музыцы і скоках пеў так званы дыфірамб - асаблівую песню ў гонар Бахуса, дзе адлюстроўваліся сумныя і радасныя падзеі з жыцця бога.

Кастрычнік - сярэдні месяц восені, характарызуецца зменлівым надвор`ем: бываюць густыя туманы, слата, частыя замаразкі, а часам выпадае і снег. Дрэвы стаяць аголеныя, птушкі адляцелі ў вырай. Наступае пара для садаводаў: пасадка дрэў і ягаднікаў, абмазванне ствалоў глінай і вапнай, іх ацяпленне.

Народны каляндар месяцы небагаты. Яго асноўнае свята - Пакровы. У скарбніцы сялянскай мудрасці маюцца прыкметы, па якіх вызначаецца надвор`е як на бліжэйшыя дні, так і на вялікі тэрмін - зіму і вясну.

9/26. Іван Багаслоў (Багуслаў). Гэты дзень - мяжа ўсім шанаванням дбайнага земляроба, бо зямля атрымлівае за свае дары нябеснае благаславенне на спакой да самае вясны. Няўпраўнасць гаспадара дакаралася ў народзе: "Хто не дасее да Івана Багаслова, той не варты добрага слова". Галоўнай жа прыкметай дня быў пачатак восеньскіх вяселляў - свацці і жаніха дамаўляліся пра дзяўчат на выданні, што гучыць у прыказцы: "Іван Багуслаў дружкі разаслаў".

14/1. Пакровы (Пакроў, Трэцяя Прачыстая). Народнае свята глыбокай восені, пасля яго пачынаецца зіма. Свята не вызначаецца абрадамі. Сяляне стараліся закончыць палявыя работы, усебакова падрыхтавацца да зімы. Пра

гэты дзень вядома шмат прымавак: "Прыйшла Пакрова, пытае, ці да зімы гатова", "Калі да Пакроў не было снегу, не будзе яго яшчэ два тыдні", "На Пакроў мароз - сей пад кустом авёс".

Адбываюцца змены ў прыродзе: "Прыйшла Пакрова - усохла дуброва", "Свята Пакрова, пакрый зямельку лісточкам, а галоўку вяночкам". Становіцца менш корму жывёле на лугах, і ўжо заканчваюць выганяць кароў на пашу, разлічваюцца з пастухамі. "На Пакрова дай сена карове", "Прыйшла Пакроўка - не дала малака кароўка (гэта значыць запускаецца); не пакрые зямлю лістом, а пакрые снегам".

Пакроў заўсёды чакалі, бо тады было менш работы. Наступала пара асенніх вяселляў. На Брэшчыне дзяўчаты збіралі ў фартух лісце і пасля вытрасалі з прыполу - куды вецер панясе, - туды і замуж ісці.

Пачыналася пара апрацоўкі лёну, аддзялялі валакно ад кастрыцы. Таксама гэта час асенняга набору ў войска. Моладзь збіралася на вячоркі.

У народным уяўленні свята атаясамлівалася з дзеясловам "пакрываць". У валачобнай песні спяваецца: "Святы Пакроў пакрыў зямлю жоўтым лістом, маладым сняжком, ваду лёдам, пчалу мёдам, дзеўку вянком ..."(Васілевіч, 1998). Па ўсім адчуваецца, што народнае ўяўленне паходзіць з хрысціянскага свята Пакрова Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі, якое ў Рускай Царкве было ўведзена каля 1164 года.

Пакроў Прасвятой Багародзіцы з`явіўся ў 910 годзе ў Канстанцінопалі ў Влахернскай царвке, у якой захавалася Рыза Богамаці, яе галаўны ўбор (мафор) і частка пояса, перанесенага з Палесціны ў V ст. 1 кастрычніка ў час начнога малення адбыўся цуд з`яўлення ў паветры Прасвятой Уладаркі, акружанай анёламі і святымі, якая, зняўшы з галавы пакрывала, пакрыла ім людзей, абараняючы іх ад ворогаў. "Святы Пакроў пакрые людзей ад грахоў".

**ЛІСТАПАД**

Лістапад - верасnёўскі ўнук, кастрычнікаў сын, зіме бацюхна родны.

У лістападзе гола ў садзе.

Лістапад зіме сцежку пракладае.

Лістапад-паўзімнік: мужык з калёсамі развітваецца, у сані перабіраецца.

Лістапад снегу навее - хлеба прыбудзе, а вада разальецца - сена набярэцца.

Апошні месяц восені, адзінаццаты - года меў старабеларускаую назву грудзень (ад слова "груды" ў значэнні "замёрзлая зямля"). Сучаснае беларускае найменне лістапад тлумачыцца проста: канец ападання лісця з дрэў (таксама ва ўкраінцаў листопад, палякаў і чэхаў listopad). Рускі ноябрь, балгарскі ноември, нямецкі, вянгерскі, славацкі nowember, утрымліваюць агульную лацінскую аснову novem (дзевяць). У старажытнарымскім календары november - дзевяты.

У пачатку лістапада адлятаюць апошнія чароды качак, дрэвы стаяць ужо амаль без лісця, з`яўляюцца туманы. Вёска на нейкі час вызваляецца ад

сельскагаспадарчых работ. Дары асенняга поля і лесу ўжо добра ўладкаваны ў склепах і кладоўках. Самы час успомніць тых апекуноў, якія спрыялі земляробу, і, у першую чаргу, продкаў, "дзядоў". Багаты стол запрашае сватоў парадніць сваіх дзяцей. А вечары, што сталі даўжэйшымі, нагадваюць жанчынам аб кудзелі і піліпаўскіх вячорках.

Як звычайна, назіранні селяніна накіраваны на стан прыроды, паводзіны жывёлы, птушак, па якіх ён вызначае будучае надвор`е. Неба ўсю ноч чыстае, але вакол месяца з`явіліся вялікія кругі - будзе мароз; калі ж кругі гэтыя злёгку пачырванеюць - магчыма нават снегапад з ветрам. Калі дым з коміна падымаецца вертыкальна ўверх, няхай сабе і ў непагадзь, хутка надвор`е наладзіцца.

1/19. Усе Святыя. Памінальны дзень у беларусаў-католікаў. "Усе святыя як засваволяць - дрэвы да рэшты аголяць". Варылі кашу, ставілі на стол стакан вады, клалі хлеб і столькі лыжак, колькі ў хаце "дзядоў" (памерлых продкаў).

Дзень Усіх Святых (Odnissanti - італьян.) быў уведзены ў 610 годзе папай Баніфацыем IV і прызначаны на 13 мая. У IX стагоддзі папа Грыгорый IV перанёс яго на 1 лістапада. А ў 998 годзе (ці ў 1030 г.) было ўведзена яшчэ адно свята - дзень памяці памерлых (2 лістапада). Яны зліліся ў адно - "святыя і памерлыя" (santi e morti - італьян.).

2/20. Задушны дзень. Працяг памінальных дзён у католікаў.

Асяніны (Змітраўка, Змітравы Дзяды, Казанскія Дзяды, Мясніцы). Памінальны дзень перад Змітрам (пятніца). Гаспадар заклікаў "дзядоў" за стол сесці такімі словамі:

Святыя дзяды завём вас,
Хадзіце да нас!
Ёсць тут усё, што Бог даў,
Што я для вас ахвяраваў,
Чым толькі хата багата.
Святыя дзяды! Просім вас,
Хадзіце, ляціце да нас.
А выпраўляючы душы памерлых продкаў гаварыў:

Святыя дзяды
Зляталісь сюды,
Есці - пад`елі,
Піць - напіліся,
Чэсць і слава вам!
Цяпер скажыце нам,
Чаго вам трэба?
А лепей:
Ляціце ў неба!

Пра гэтыя дні таксама казалі: "Жылі дзяды - не бачылі бяды, а ўнукі набраліся мукі", "Ад Змітраўкі да Юр`я ваўкі ядуць усё, што толькі трапіцца, і нападаюць на ўсякую жывёлу без разбору".

Змітрава (Памінальная, Радзіцельская, Тоўстая) субота. Працяг Асянін. Старадаўнія язычніцкія традыцыі ўшанавання душ продкаў зліліся з хрысціянскімі днямі памінання памерлых ("усопшых"), якія адзначаюцца ў праваслаўных сем разоў на год. Першая паніхіда праваслаўнай Змітраўскай бацькоўскай суботы была праведзена ў Троіцкім манастыры прападобным Сергіем Раданежскім у прысутнасці Дзмітрыя Данскога 2 лістапада 1380 года па воінах, якія загінулі на Куліковым полі.

4/22. Казанская. "Хто на Казанскую жаніхаецца, той не пакаецца". У праваслаўным царкоўным календары - святкаванне Казанскага абраза Божай Маці (у памяць выратавання Масквы і Расіі ў 1612 г.).

Гэта быў смутны час для Расіі, калі Польскае каралеўства ў саюзе з Вялікім княствам Літоўскім пастаўляла на царскі прастол "лжэдзмітрыяў" і нават завалодала сталіцай. Апалчэнцам Дзмітрыя Пажарскага быў прысланы з Казані цудатворны абраз Прасвятой Багародзіцы, які, па прадбачанню святога Арсенія, павінен заступіцца за рускае войска, што вызваліць Маскву.

Беларускі народны каляндар, як і рускі, нічога не згадвае пра гісторыю. За прысвяткам замацаваліся цікавыя народныя назіранні. Да Казанскай - не зіма, а пасля - не восень; зранку - дождж, звечара - снег. На Казанскую дождж пойдзе - зіму прывядзе. Выязджай на Казанскую на калёсах, але палазы з сабой прыхапі. "Што Казанская пакажа, тое й зіма скажа".

8/26. Зміцер (Змітрок, Дзмітры). "Хітры" дзень, канец надзеі выйсці замуж у гэтым годзе. Адлюстраваны ў прымаўках: "Да Дзмітра - дзеўка хітра, а па Дзмітры - мужчыны хітры", "Да Змітра пасуць, а па Змітру пільнуюць".

На Змітра не пралі, не ткалі і ў полі не працавалі. Змітраў дзень параўноўваюць у прыродных прыкметах з Вялікаднем і іншымі святамі. "Змітрок па снегу - і Вялікдзень па снегу, а Змітрок голы - і Вялікдзень таксама".

10/28. Параскі (Параскева Пяценка, Параскеўя Пятніца, Параскімка, Параскі Асеннія). Дзень забароны прадзення і ткання; заступніца жанчын і сям`і, апякунка жаночага рукадзелля. Існавалі павер`і: хто будзе прасці, то з-пад печкі вылезе Пятніца і пакарае; яна ў выглядзе старой бабы ходзіць па вёсках і строга глядзіць, каб ніхто не праў кудзелю ў пятніцу. Царква да гэтага дня прыстасавала святкаванне святой Параскевы Пятніцы - велікапакутніцы, якая жыла ў II стагоддзі ў Іконіі.

Папулярнасць Параскевы Пятніцы праяўляецца не толькі ў шматлікіх легендах, але і ў народным мастацтве (іканапісе, вышыўцы, ткацтве). Адчуваецца, што за яе вобразам стаіць больш ранейшы язычніцкі культ. Акадэмік Б. Рыбакоў лічыць, што "маці ўраджаю", "багіня жыццёвага дабрабыту і дастатку" з`яўляецца Макаша. "На працягу сярэдневякоўя адбывалася адцясненне Макашы хрысціянскай Багародзіцай і замена ёю старажытнай язычніцкай багіні. Культ Макашы пераўтварыўся ў культ

хрысціянскай Параскевы Пятніцы"(Рыбаков Б. Язычество Древней Руси. М., 1988).

14/1. Кузьма-Дзям`ян (Кузьмінкі). Апякун земляробства і вяселля. Існуюць паданнні пра кавалёў Кузьму і Дзям`яна, якія змагаліся са змеем. У некаторых раёнах на Кузьмінкі святкавалі першую сустрэчу зімы, што адлюстравана ў прыкметах: "Не закавацъ зіме раку да Кузьмы", "Калі Кузьма закуе, дык Міхайла раскуе". Як паказваюць іншыя фальклорныя матэрыялы, кавалі з`яўляюцца сімвалам шлюбу і сям`і. Аб апякунстве хрысціянскага шлюбу распавядаюць і царкоўныя жыццяапісанні святых братоў Касьмы і Даміяна Асійскіх (III ст.), якія нават пасля смерці сваёй дапамагалі жанчыне, якую хацеў абняславіць зладзей. Акадэмік Б. Рыбакоў нездарма выказвае меркаванне, што дахрысціянскім імем чараўніка-каваля мог быць Сварог, або Сварожыч-агонь.

Піліпаўскія запускі (па 27 снежня). Апошнія дні перад Піліпаўкай.

21/8. Міхайлаў дзень (Міхаіл, Міхайла Архайла, Міхаіл Страхадзёр). Апошняе свята года; абаронца ад грому. Унукі ў гэты дзень наведвалі сваіх бабуль. У народзе бытуе: да Міхайла трэба выткаць адны кросны, другія - у Піліпаўку, трэція - у Мясаед, а чацвёртыя - у пост. Са святам звязана і пацяпленне, так званыя Міхайлавы адлігі: "На Міхайлу раздарожжа - да зімовага Міхайлы шляху не будзе". Як і 19 верасня, так і ў гэты дзень Міхайла асацыіруецца з цудамі прыроднай стыхіі - громам і вятрамі. Народны вобраз мае сувязь з днём хрысціянскай памяці Сабора Архістраціга Міхаіла і іншых нябесных сіл. Архістраціг Міхаіл за свае подзвігі і цуды пастаўлены Госпадам Богам галоўным над усімі ангельскімі чынамі. На абразах ён малюецца з зялёнай фінікавай галінкай у левай руцэ, а ў правай - з кап`ём ці мячом і белай харугвіей.

Піліпаўскія дзяды. Памінальны дзень перад Піліпаўкай у пятніцу і суботу (Заходняе Палессе).

Піліпаўскія (Піліпавы, Калядныя) запусты (заговіны). Дзень перад Піліпаўкай. Клікалі ў госці бабу, што "пупы вяжа". Жанчыны заканчвалі апрацоўку льну, канапель, рыхтаваліся да піліпаўскіх вячорак. З запустамі звязана нямала прыкмет: "Калі непагадзь суправаджае Калядныя запусты, то можна разлічваць на ўраджайнае лета".

28/15. Піліпаўка (Калядны, Піліпаўскі пост). Шасцітыднёвы перадкалядны пост (да 7 студзеня). Не елі скаромнага. Не рабілі вяселляў. Дзяўчаты хадзілі на вячоркі. Гаварылі: "У Піліпаўку дзень да палудня". Заўважалі, калі на Піліпаўку надвор`е хмарнае або снежнае, то травень будзе мокры. Гэтая зімовая пара пераклікаецца з адпаведнай вясноваю: "Калі добра пагода будзе на Піліпаўку, то добра будзе і на Пятроўку". Лічылася, што ў Піліпаўку збіралася "воўчае вяселле", хадзілі ваўкі зграямі.

## СНЕЖАНЬ

Снежань зіму пачынае, а год канчае.

Снежань сцюжны з зімою дружны.

Снежань вока снегам цешыць, ды марозам вуха рве.

Сухі снежань - сухая вясна, сухое лета.

Першы месяц зімы і апошні каляндарнага года атрымаў назву снежань ад слова "снег". Старабеларускае найменне яго - прасінець (у значэнні "прасвет у воблаках"), старарускае - студеный. Рускі декабрь, англійскі December паходзіць ад лацінскага december (дзесяты - у старажытнарымскім календары).

Здавён у гэтым месяцы асноўная праца сялян пераходзіла ў хату. Доўгімі зімовымі вечарамі гарэла лучына ў пасвеце ці на лучніку. Мужчыны займаліся дробным рамяством, рамонтам. Жанчыны ж пасля сядзення за грэбенем ці прасніцаю браліся ткаць кросны. Раней яны стаялі амаль у кожнай хаце.

Добра быў развіты прагноз надвор`я, стан будучай вясны па зімовых прыкметах. Народныя веды замацоўваліся ў трапным прыказках і прымаўках. Снежань жыў чаканнем калядных свят.

4/21. Увядзенне (Вадзенне, Уводзіны). Звязана з хрысціянскім святкаваннем Увядзення ў храм Прасвятой Уладаркі нашай Багародзіцы і Прыснадзевы Марыі. Бяздзетныя бацькі Іаакім і Ганна паабяцалі, што ў выпадку нараджэння ў іх дзіцяці, прысвецяць яго на служэнне Богу. І вось у гэты дзень трохгадовая атраковіца пры запаленых свечках падымаецца па пятнаццаці прыступках храма і першасвятар уводзіць яе ў Святыя Святых. Для хрысціян гэтае свята - сімвал увядзення грэшнага свету ў храм, без якога ён загіне, пачатак уратавання.

У народзе назва прысвятка звязана са словам "вядзенне". Кажуць: "Увядзенне, што свят навядзе", "Увядзенне прыйшло - зіму прывяло."

9/26. Юр`е Зімовы (Юр`еў дзень, Ягорый). У царкоўным календары - Асвячэнне храма Велікапакутніка Георгія ў Кіеве.

На Юр`е зіма ўбіраецца ў поўную сілу. Аб гэтым сведчаць прыказкі і прыкметы: "Юры мосціць, а Мікола гвоздзіць", "Колькі на асенняга Юр`я снегу, столькі на вясенняга - травы".

Юрый лічыўся апекуном свойскай і лясной жывёлы. У гэты дзень ён нібы выпускаў ваўкоў аж да вясенняга Юр`я. Гаспадары аглядалі кароў, коней. Больш не выганялі на пашу кароў, бо: "Юрэй ужэ дае ваўкам слабоду". Вядома гістарычная прыказка: "Вось табе, бабуля, і Юр`еў дзень". Ад Юр`я сялянам не дазвалялася пераходзіць на службу ад аднаго пана да другога.

13/30. Андросы (Андрос, Андрэй, Андрэйкі). Дзявочае свята. Народная традыцыя амаль нічым не звязана з хрысціянскім праслаўленнем апостала Андрэя Першазванага. Гэта адзін з 12 вучняў Хрыста, брат апостала Пятра. Пасля зыходжання Святога Духа апостал Андрэй з Віфсаіды прапаведаваў у І стагоддзі Евангелле ў розных краінах, у тым лік і на славянскіх землях. Празваны Першазваным таму, што першы быў прызваны Хрыстом на апостальскае служэнне.

Беларуская народная традыцыя захавала нямала абрадаў, гульняў, прыкмет і асабліва варожбаў на гэты дзень. Дзяўчаты варажылі так, як і

перад Новым годам: на бліны, крычалі ў калодзеж і абсявалі яго каноплямі, бегалі пад суседскія вокны пачуць, пра што гавораць у хаце, і інш.

19/6. Мікола Зімовы (Міколы, Мікольшчына). Багата адлюстраваны ў прымаўках: "Без Міколы не бывае ні зімы, ні лета", "Хвалі зіму на Міколе", "Да Міколы няма зімы ніколі".

Як і многія святы і прысвяткі ў гонар гістарычных асоб, і гэты дзень, што прызначаны свяціцелю Мікалаю, архіепіскапу Мір Лікійскіх, цудатворцу, сваім зместам не адлюстроўвае ні біяграфію, ні жыццёвых подзвігаў гэтага вядомага не толькі ў хрысціянскім свеце чалавека, які жыў у другой палове III стагоддзя ў Малой азіі.

Адвент. Тры тыдні перад Раством. Каталіцкае свята непарочнага зачацця Божай Маці. Хрысціянская царква разглядае Адвент як час духоўнай падрыхтоўкі да святкавання Нараджэння Хрыстова, якое заключаецца ў пасце і пакаянні.

22/9. Ганны (Ганкі, Ганна). Прысвятак, ад якога да Каляд застаецца роўна два тыдні. Яшчэ фальклярыст М.Нікіфароўскі заўважаў: "Па зіме і лета звычайна гавораць пра летняе надвор`е, калі параўноўваюць яго з перажытым зімовым. Гэтае параўнанне ідзе ад зімовае Ганны і ад дня павароту сонца на зіму (22 чэрвеня), што адбываецца за 20 дзён да Пятра". Гэты прыкметны ў годзе дзень (з астранамічнага пункту погляду - 21-22 снежня з`яўляецца днём зімовага сонцастаяння, на што вялікую ўвагу звярталі яшчэ язычнікі) прысвечаны шанаванню праведнай Анны, маці Багародзіцы. Католікі прысвячаюць гэтай падзей 26 ліпеня, дзень блізкі да летняга раўнадзенства.

24/11. Посная куцця. Пачатак Каляд (да 6 студзеня). Дзяўчаты варажылі, ці хутка выйдуць замуж. Насілі з песнямі "звязду". Бытавалі прыказкі і прымаўкі звычайна тыя ж, што і ў праваслаўных: "Прыйшлі Калядкі, гаспадарам парадкі", "Калядкі - добрыя святкі: бліны ды аладкі", "На Каляды ясна - ясна й на Пятры".

25/12. Раство каталіцкае (Каляды).

31/18. Багатая (Шчодрая) куцця (гл. 13 студзеня). Новы год. У самы апошні дзень года наглядалі за прыродай, надвор`ем: якое надвор`е перад Новым годам - такое будзе й перад Пятром; светлае неба - на багатую Куццю, вясёлы год; калі перад Васілём (1 студзеня) снег - чакаецца добры ўраджай.